Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. АЎТОРАК № 196 (29565)



АЛЕЙНЫЯ АКВАРЭЛІ МІХАІЛА ЛЯЎКОВІЧА 5

У СПАДЧЫНУ — І ХАТА, І ДАЎГІ 7



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЕЛІВЁРСТАЎ, міністр фінансаў:**

*«Па выніках гэтага года бюджэтныя чаканні сціплыя, але пазітыўныя. Першапачаткова, калі мы фарміравалі яго на бягучы год, выходзілі з кансерватыўных ацэнак. Тады было незразумела, як краіна будзе выходзіць з пандэміі, колькі атрымаецца зарабіць эканоміцы. У нас быў даволі важкі дэфіцыт, на ўзроўні Br4 млрд, які з улікам удакладненняў у пачатку года ўзрос да Br6 млрд — больш за 3 % ВУП. Яго планавалася пакрыць за кошт рэштак бюджэту, «падушкі», якую мы назапасілі ў папярэднія гады. Але па выніках 9 месяцаў наш дэфіцыт складае крыху больш як Br1 млрд, менш за 1 % ВУП. Бюджэт на наступны год плануецца ў эканомных умовах і з улікам кансерватыўных сцэнарыяў. Групуюцца ўсе прыбыткі, выключаюцца расходы, якія могуць пачакаць, каб максімальна быць у балансе і мець рэзервы. Пры гэтым на бюджэтнікаў не будзе дадатковай нагрузкі. Рост заработнай платы ў любым выпадку будзе. Ён будзе мець рэальнае значэнне, гэта значыць, мае быць вышэйшы, чым інфляцыя».*

# Купалава восень



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Масквічка Юлія ФІРСАВА любіць бываць у нашай краіне, яна аб'ездзіла ўсе знакавыя месцы Беларусі. А на радзіму Янкі Купалы, у Вязынку, прыехала гэтай восенню яшчэ раз — прызнаецца: вельмі хацела пабачыць, як выглядаюць мясціны, дзе нарадзіўся вядомы паэт, у самы рамантычны час года.**

Далучайцеся!

## МАМАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

### Пачаўся Тыдзень маці

**Па ўсёй краіне 11—17 кастрычніка пройдуць разнапланавыя тэматычныя мерапрыемствы, расказалі БелТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

З учарашняга дня ў гарадах, абласных цэнтрах стартавалі ўрачыстыя прыёмы, на якіх шматдзетных жанчын узнагароджваюць ордэнам Маці. Усіх маці будуць ушаноўваць у працоўных калектывах, дзе пройдуць святочныя мерапрыемствы, канцэрты і акцыі. У тым ліку запланаваны ведамасныя рэспубліканскія акцыі, прамыя тэлефонныя лініі органаў выканаўчай улады па пытаннях дзяржпадтрымкі сем'яў з дзецьмі, круглыя сталы, прэс-канферэнцыі па пытаннях фарміравання здаровага спосабу жыцця і аховы рэпрадуктыўнага здароўя, бясплатнае прававое кансультаванне для шматдзетных маці і тых, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, магчымасць набыць паштовыя карткі і бясплатна адправіць віншаванне мамам, бабулям, сёстрам, сяброўкам і калегам па Беларусі, правядзенне заняткаў па бяспецы для маладых маці, тэматычныя пасадкі памятных алей і малебен ва ўсіх храмах краіны аб здароўі маці.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 3

Будзьце здаровы!

## «РАІМ УСІМ «УКАЛОЦЦА»

### Чаму пенсіянеры ДРАПКОВЫ з Крупскага раёна вырашылі прышчапіцца ад каранавіруса

**Вёска Малая Слабада знаходзіцца далекавата ад райцэнтра. У населеным пункце няма вытворчасцяў, цэнтральнага водаправода, ацяпляюцца дамы печамі на цвёрдым паліве. Жыве 48 чалавек, у асноўным пенсіянеры. У тым ліку і Ніна Яўгенаўна Драпкова са сваім мужам Анатолем Сяргеевічам. А прыехалі мы з медыкамі да іх не ў госці, а з канкрэтнай мэтай. Работнікі аховы здароўя — каб зрабіць сужэнцам прышчэпку ад COVID-19, а журналісты з дазволу гаспадароў — пагутарць з імі, чаму прынялі такое рашэнне.**

СТАР. 3



## КОРАТКА

- **Беларусь і Расія плануюць наладзіць абмен электроннымі паслугамі.**
- Натарыусы бясплатна пракансультуюць шматдзетных мам 14 кастрычніка.
- **Прышчэпленыя ад каранавіруса заўзятары змогуць бясплатна наведваць матчы брэсцкага «Дынама».**

ISSN 1990 — 763X

21196

9 771990 763008

# Каранавірус, «Нафтан» і Канстытуцыя

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу са студэнтамі і маладымі выкладчыкамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

Наталля Качанава адзначыла, што шчыра рада быць у родным горадзе і ВНУ. Традыцыйна дэпутаты і сенатары сустракаюцца з працоўнымі калектывамі, выкладчыкамі, студэнтамі. Адной з узнятых тэм стала пандэмія. Спікер верхняй палаты парламента заклікала прысутных вакцынавацца і не верыць псеўданавуковым расповедам пра неэфектыўнасць вакцыны і яе небяспеку для здароўя.

«Вядома, сітуацыя сур'ёзная, вірус муціруе. Зараз больш хварэе моладзі, дзяцей і цяжарных — у першую хвалю такіх пацыентаў было менш. Каб змагацца з гэтай хваробай, трэба вакцынавацца — гэта выратаванне. У краінах, якія маюць працэнт прышчэпленых 70 і больш, сітуацыя паляпшаецца. Не разумею, чаму людзі сумняваюцца, ці трэба вакцынавацца», — сказала Наталля Качанава. Яна дадала, што сама перахварэла, адразу было дастаткова антыцелаў, але праз некаторы час прышчапілася. Пазней плануе вакцынавацца яшчэ раз.

Малады выкладчык ВНУ закрануў пытанне будучага рэферэндуму па Канстытуцыі, якія змены плануюць прапанаваць. У ліку выказаных ідэй на пасяджэнні камісіі — наданне канстытуцыйнага статусу Усебеларускаму народнаму сходу, увядзенне ўпаўнаважанага па правах чалавека, стварэнне адзінага дня галасавання — у пэўную дату будуць абраныя дэпутаты ўсіх узроўняў. «Раней ва УНС быў дарадчы статус, але цяпер плануецца змяніць гэта. Таксама ўсе падтрымліваюць, што павінна застацца прэзідэнцкая форма праўлення, яна сябе зарэкамендавала», — адзначыла Наталля Качанава.

Акрамя таго, па выніках рэферэндуму могуць быць пашыраныя паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда, прапануецца павялічыць узрост кандыдатаў у прэзідэнты (40 гадоў замест 35), такі чалавек павінен пражыць у краіне не менш за 20 гадоў. Папярэдне ў Асноўным Законе падкарэкціравалі 54 артыкулы, прапісалі тэзісы пра моладзь, духоўна-маральнае выхаванне, гістарычную памяць, недапушчальнасць перапісвання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама што шлюб — гэта саюз мужчыны і жанчыны.

Наталля Качанава заклікала маладых людзей крытычна ставіцца да інфармацыі, умець адрозніваць праўду ад хлусні і маніпуляцый. У гэтым важная роля СМІ, прысутнасці органаў улады ў інтэрнэце. «Суверэнітэт і незалежнасць, можа, не так складана атрымаць, як захаваць. У нашай краіне рэалізаваць сябе можа любы чалавек, таму Беларусь трэба захоўваць, развіваць. Нельга паддавацца эмоцыям і розным заклікам звонку, якія ідуць на развал краіны», — сказала яна студэнтам.

Закранулі ўдзельнікі дыялогу і развіццё Полацкага раёна, мадэрнізацыю важнага прадпрыемства ў рэгіёне — «Нафтана». «Удасканаленне завода неабходна. Напрыклад, зараз пабудавалі ўстаноўку запаволенага каксавання, некалькі разоў пераносіліся тэрміны яе запуску, што не вельмі добра. Мы разумеем важнасць работы завода і падтрымліваем яго», — расказала Наталля Качанава і дадала, што пасля нядаўняга пажару на прадпрыемстве працуе следства і высвятляе прычыны здарэння. Яна таксама падкрэсліла важнасць ПДУ ў падрыхтоўцы кадраў для «Нафтана».

Падчас сустрэчы таксама абмяркоўвалі важнасць заняткаў спортам, стварэнне беларускай крыптавалюты, супрацоўніцтва з дзяржавамі, развіццё IT-галіны і сферы адукацыі.

Падводзячы вынікі сустрэчы, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што дыялог атрымаўся і прайшоў у душэўнай атмасферы.

**Паводле БелТА.**

Кантэкст

# Восеньскае абвастрэнне

**Гэтым разам абудзіліся еўрадэпутаты. Еўрапарламент прыняў рэзалюцыю, у якой заклікаў ЕС «узмацніць адрасныя эканамічныя санкцыі з акцэнтам на ключавыя сектары эканомікі Беларусі». У прыватнасці, прапануецца ўвесці абмежавальныя меры ў дачыненні да чорнай металургіі, вытворчасці або апрацоўкі дрэва, хімічнай прамысловасці, а таксама да ўсіх дзяржаўных банкаў і ключавых кампаній, напрыклад, «Беларуськалій» і «Белтэлекам». Таксама дэпутаты запатрабавалі ўвядзення дадатковых мер супраць Расіі, калі яна працягне падтрымліваць Мінск. У дакуменце Еўрапарламент таксама перасцярог Расію і Беларусь ад працягу перагавораў аб большай інтэграцыі.**

Вядома, чулі мы такое, і неаднойчы. І ведаем, якім чынам тут дзейнічаць. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заклікае не драматызаваць сітуацыю з заходнімі санкцыямі. Пра гэта ён заявіў на нарадзе аб процідзеянні санкцыйным мерам. «Мы ўжо прывыклі да розных санкцый, не першы раз з імі сутыкаемся. Чарговыя спробы абмежаваць і запалохаць нас працуюць супраць бізнесу і эканомікі той краіны, якая ўводзіць санкцыі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта ўжо адчулі на сабе і Прыбалтыйскія краіны, і Польшча, і Украіна. Мы па многіх каналах падтрымліваем кантакты з прадстаўнікамі гэтых дзяржаў, і яны ў адзін голас пра гэта гавораць. Ды і не толькі яны».

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь геаграфічна знаходзіцца не дзесьці ў кутку планеты або якога-небудзь рэгіёна, а на самым скрыжаванні. «І закрыць краіну, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, немагчыма. Гэта вар'яцтва», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што Беларусь заўсёды была надзейным партнёрам на знешніх рынках. «Мы асабліва ўважліва глядзім на Афрыканскі і Азіяцкі рэгіёны, дзе жыве 5,5 мільярда чалавек — 70 працэнтаў насельніцтва», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што цяперашняя сітуацыя для Беларусі — гэта выклік, пэўны выхад з зоны камфорту. «Але ў той жа час гэта момант адкрыць новыя магчымасці, мабілізавацца і дасягнуць выніку, нягледзячы ні на які націск», — сказаў ён.

Яскравае пацвярджэнне — сітуацыя ў айчынным аграпрамысловым комплексе, адным з відавочных драйвераў беларускай эканомікі, у тым ліку і на экспартным кірунку. Беларускія сельгасвытворцы і перапрацоўшчыкі плануюць перавысіць паказчык у шэсць мільярдаў долараў харчовага экспарту. Пра гэта паведаміў у эфіры тэлеканала СТВ намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей Багданаў. Па яго словах, за восем месяцаў гэтага года Беларусь экспартавала ў розныя краіны сваю сельгаспрадукцыю на $4,1 млн. Гэта на 10,8 працэнта больш, чым летась.

Адносна магчымага ўплыву еўрапейскіх санкцый намеснік міністра адзначыў, што Беларусь даўно «дыверсіфікавала свой знешнегандлёвы пакет такім чынам, каб немагчыма было нейкай краіне супраць нас нешта зрабіць». «І ніякія санкцыі на нас не паўплываюць», — перакананы Аляксей Багданаў. Ён прывёў характэрную статыстыку: пастаўкі беларускіх прадуктаў харчавання ў ЕС узраслі на 43 працэнты. Акрамя таго, цяпер актыўна развіваецца напрамак краін СНД, азіяцкі вектар. У гэтым годзе, у параўнанні з мінулым, на 40 працэнтаў дадаў экспарт у Кітай (пастаўлена на 216 мільёнаў долараў).

Пакуль складана сказаць, калі Еўрасаюз супакоіцца. Такое меркаванне ў эфіры «Альфа Радыё» выказаў палітолаг Аляксандр Шпакоўскі, каменціруючы санкцыі ЕС у дачыненні да Беларусі. «Будзе і пяты, і шосты пакет санкцый. Яны не могуць саступіць, бо ўкладзена шмат сіл і сродкаў. Тут яшчэ і маральны момант, бо Аляксандр Лукашэнка мокрай пальчаткай адхвастаў па мардасах глабальную еўрапейскую вярхушку. Прычым некалькі разоў: і ў сітуацыі з каранавірусам, і пры падаўленні «каляровай рэвалюцыі», і калі з самалёта канфіскавалі бандыта Пратасевіча, і ў нядаўнім інтэрв'ю журналісту CNN. Прэзідэнт зараз настолькі моцны, як у свае лепшыя маладыя гады. Ён неаднаразова казаў, што будзе сыходзіць, і я перакананы, што, калі настане гэты момант, вялікая колькасць людзей будзе ўпрошваць Лукашэнку застацца», — падкрэсліў эксперт. Аляксандр Шпакоўскі адзначыў, што Беларусь будуць яшчэ не раз спрабаваць караць, аднак цяпер задача дзяржавы заключаецца ў выбудоўванні схем, якія дапамогуць пазбегнуць негатыўных наступстваў ад санкцый. Акрамя таго, важна пераарыентавацца на тых партнёраў, якія гатовыя працаваць з нашай краінай.

Палітолаг Вадзім Баравік таксама звярнуў увагу на работу беларускай эканомікі ў перыяд санкцый: Захаду не ўдалося дабіцца чаканага эфекту. «Мы, з аднаго боку, развіваемся дзякуючы таму, што маем досвед работы ў перыяд санкцый, бо мы ўвесь час пад санкцыямі. Па-другое, мы праяўлялі ўменне трымаць сябе ў руках і ўменне лавіраваць. Мы ўмеем эфектыўна ў перыяд санкцый перабудоўваць гандлёва-эканамічныя ланцужкі, прапрацоўваць юрыдычныя схемы, каб нашы тавары трапілі на рынкі», — заявіў Вадзім Баравік.

Рэзалюцыя Еўрапарламента па Беларусі накіравана на расхістванне нашых адносін з Расіяй. Пра гэта ў эфіры «Альфа Радыё» заявіў палітолаг Аляксей Дзермант. Паводле яго слоў, на Захадзе лічаць, што іх саюзы правільныя, у іх дэмакратыя, а ўсім астатнім аб'ядноўвацца нельга. «Пагардлівы падыход у адносінах да ўсіх астатніх. Вядома, з такімі ўстаноўкамі яны не тое што з суседзямі нармальных адносін не будуць мець, але і ўнутры. Усе бачаць, што Еўрасаюз далёка не ідэальны і не з'яўляецца эталонам інтэграцыйных аб'яднанняў, там ёсць сур'ёзныя супярэчнасці. Яны бачаць канкурэнтаў у іншых і ставяцца да іншых эгаістычна і непаважліва. Нам, калі мы лічым сябе самастойнымі, ганарымся і шануем свой суверэнітэт, трэба думаць пра свае інтарэсы і выгаду. Мы гэтую цікавасць бачым у саюзе з Расіяй, што апраўдана, лагічна і даказана часам», — падкрэсліў палітолаг.

Прыняцце Еўрапарламентам рэзалюцыі, якая асуджае інтэграцыю Расіі і Беларусі, з'яўляецца беспрэцэдэнтным прыкладам умяшання ў справы суверэнных дзяржаў. Пра гэта заявіў ТАСС дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў. Паводле яго слоў, грамадзяне дзяржаў Еўрапейскага саюза, якія абралі дэпутатаў Еўрапарламента, маюць права чакаць ад іх вырашэння вострых, актуальных праблем, якія хвалююць мільёны жыхароў 27 краін кантынента.

Паводле яго слоў, «у Страсбургу быццам не заўважаюць знешніх выклікаў і пагроз сучаснага свету — COVID-19, тэрарызму і пытанняў кібербяспекі, міграцыйнага крызісу, супярэчнасцяў у рэалізацыі глабальнай Праграмы ўстойлівага развіцця, прапанаванай ААН, шматлікіх іншых праблем і супярэчнасцяў». Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы адзначыў, што прыняцце Еўрапарламентам гэтай рэзалюцыі не зможа негатыўна паўплываць на перагаворы аб інтэграцыі. «Наіўна лічыць, што прыняты Еўрапарламентам дакумент нейкім чынам можа затармазіць перагаворны працэс, які паспяхова вядзе Беларусь і Расію па эканамічным інтэграцыйным парадку дня, як і негатыўна паўплываць на ўзаемадзеянне паміж Масквой і Мінскам на карысць умацавання рэгіянальнай бяспекі і абароннага патэнцыялу», — заявіў Дзмітрый Мезенцаў.

Уменне абараніць свой суверэнітэт і засцерагчы жыццё грамадзян — найвышэйшая мэта любой дзяржавы. Такім меркаваннем з карэспандэнтам БелТА падзяліўся загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін. «Беларуская мадэль развіцця вытрымала сусветныя сістэмныя трансфармацыі. Прэзідэнт Беларусі, не звяртаючы ўвагі на палітычную істэрыку, ціск і санкцыі, у спакойным дзелавым рэжыме працягвае працаваць у адпаведнасці з Канстытуцыяй над жыццёва важнымі для беларускага народа пытаннямі: канстытуцыйная мадэрнізацыя, бяспека, эканамічная эфектыўнасць і рэалізацыя саюзных праграм, якасць жыцця грамадзян, даступнасць сацыяльных паслуг і гарантый. Беларусь навучылася трымаць удар», — заўважыў эксперт. І ўпарта працаваць.

**Пётр ДУНЬКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кіраўнік мінфіна ЗША прадракла катастрофу



ЗША могуць сутыкнуцца з фінансавым крызісам, калі заканадаўцам у Кангрэсе не атрымаецца да снежня ўзгадніць чарговае павышэнне гранічнага ўзроўню дзяржаўнага доўгу. Пра гэта заявіла міністр фінансаў ЗША Джанет Елен, паведаміла ТАСС. Няўдача ва ўзгадненні павышэння ліміту дзярждоўгу пагражае, па яе словах, затрымкамі ў выплаце сацыяльных дапамог, заробкаў вайскоўцам і прыпыненнем падатковых вылікаў на дзяцей. «Будзе падарваны статус каштоўных папер мінфіна — самага надзейнага ў свеце актыву, а таксама долара як сусветнай рэзервовай валюты», — заўважыла Елен, падкрэсліўшы, што «на коне стаіць занадта шмат чаго». «Немагчымасць павысіць ліміт запазычанняў, напэўна, выкліча рэцэсію і нават можа прывесці да фінансавага крызісу. Гэта было б катастрофай», — папярэдзіла міністр фінансаў.

### У Тунісе сфарміравалі новы ўрад

Адпаведны ўказ падпісаў прэзідэнт Каіс Саід. Паводле звестак тэлеканала Al Arabiya, члены кабінета міністраў на чале з прэм'ерам Наджлай Будзен Рамдан прынялі прысягу перад кіраўніком дзяржавы. Як вядома, у ліпені прэзідэнт Каіс Саід абвясціў аб прыпыненні дзейнасці парламента, адмене недатыкальнасці ўсіх дэпутатаў і адстаўцы прэм'ера Хішама Машышы. Гэтыя рашэнні былі прынятыя кіраўніком дзяржавы пасля таго, як у шэрагу буйных гарадоў адбыліся маніфестацыі, удзельнікі якіх патрабавалі роспуску парламента, змены палітычнага рэжыму і прыцягнення да адказнасці вінаватых у пагаршэнні эпідэмічнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы. Напрыканцы верасня, як інфармавалі мясцовыя СМІ, Саід даручыў Наджле Будзен Рамдан сфарміраваць новы кабмін. Яна стала першай жанчынай у гісторыі Туніса, якая ўзначаліла ўрад.

### Дзесяць краін ЕС выступілі за інтэнсіўнае развіццё ядзернай энергетыкі

Прадстаўнікі ўрадаў дзесяці краін Еўрапейскага саюза (ЕС) лічаць важным актывізаваць выкарыстанне ядзернай энергетыкі ў мэтах абароны еўрапейскіх спажыўцоў ад валацільнасці цэн. Пра гэта гаворыцца ў сумесным артыкуле, размешчаным на сайце газеты Le Figaro і іншых выданняў. З французскага боку подпіс пад публікацыяй паставілі міністр эканомікі, фінансаў і аднаўлення Бруна Ле Мэр і міністр-дэлегат па пытаннях прамысловасці пры гэтым ведамстве Аньес Панье-Рунашэ. Іх суаўтарамі выступілі прэм'ер-міністры, міністры эканомікі і міністры энергетыкі Румыніі, Чэхіі, Фінляндыі, Славакіі, Харватыі, Славеніі, Балгарыі, Польшчы і Венгрыі. «Відавочна, што напружанасць з пастаўкамі энерганосьбітаў будзе становіцца ў далейшым усё больш частай з'явай. У нас няма іншага выбару, як дыверсіфікаваць нашы крыніцы паставак, імкнучыся пры гэтым не павялічваць імпарт пазаеўрапейскай энергіі, — падкрэсліваецца ў публікацыі. — Нам неабходная ядзерная энергетыка, каб атрымаць перамогу ў бітве за клімат. Гэта наша найлепшая зброя для вядзення такога бою. Гэта крыніца чыстай, надзейнай, незалежнай і канкурэнтаздольнай энергіі».

# «РАІМ УСІМ «УКАЛОЦЦА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Перш чым прыступіць да працэсу, урач Крупскай цэнтральнай раённай бальніцы Ала Карпейчык цікавіцца ў пацыентаў станам здароўя, бескантактным тэрмометрам вымярае тэмпературу цела, партатыўным прыборам — узровень сатурацыі лёгкіх, крывяны ціск, робіць іншыя, незнаёмыя нам, далёкім ад медыцыны людзям, дзеянні. І толькі тады прыступае да працэдуры.

— Гэта ўжо другая прышчэпка, першую мы зрабілі больш як дваццаць дзён таму. Перанеслі нармальна, ніякіх пабочных рэакцый не было, — кажа Ніна Яўгенаўна. — Праўда, напачатку хвалявалася, ці ўсё будзе добра. Нам па семдзесят гадоў, муж інвалід па зроку. Але бачыце, усё абышлося. Думаю, не апошнюю ролю адыграў прафесіяналізм урачоў.

— Самі вырашылі прышчапіцца або нехта падказаў? — цікаўлюся ў сваіх суразмоўцаў.

— Мы глядзім тэлевізар, перадачы пра гэтую хваробу, выступленні ўрачоў, якія раяць прышчапіцца. Кажуць, што прышчэпленыя пацыенты радзей хварэюць на COVID-19. А калі нават падчэпяць гэтую заразу, то хвароба працякае значна лягчэй, чым у непрышчэпленых. Сярод людзей яшчэ распаўсюджана меркаванне, што пажылым людзям нельга праходзіць вакцынацыю. А мы вось рызыкнулі і не шкадуем, раім і іншым «укалоцца».

Ніна Яўгенаўна і Анатоль Сяргеевіч жывуць адны. Муж і жонка выхавалі пяцярых дзяцей, якія выраслі і разляцеліся з роднага гнязда. У іх трынаццаць унукаў, чатыры праўнукі. Яны наведваюць бабулю з дзядулем. Відаць, і гэта паўплывала на тое, што гаспадары зрабілі прышчэпкі — каб не абмяжоўваць сябе ў зносінах з самымі блізкімі людзьмі. Тры дачкі Драпковых працуюць у раённай бальніцы на розных пасадах. Яны таксама паўплывалі на рашэнне бацькоў прышчапіцца.

— Так, дзяўчаты сказалі нам: «Бацькі, прышчапляйцеся — паберажыце сябе нам на радасць», — пацвярджае гаспадыня. — Раней мы хадзілі ў госці да вяскоўцаў, суседзяў. Цяпер практычна не кантактуем, засцерагаемся. Сустракаемся толькі тады, калі аўтамагазін прыедзе, ды і то захоўваем меры бяспекі.

— З нашай вёскі выказала жаданне прышчапіцца яшчэ адна жанчына. Астатнія чакаюць, як мы зрэагуем на прышчэпкі. І толькі тады пачнуць масава вакцынавацца, — смяецца жанчына.

За станам самаадчування пацыентаў пасля прышчэпкі назірала ўрач. І толькі пасля таго як упэўнілася, што сітуацыя стабільная, развіталася.

Падчас працэдуры вакцынацыі ў хаце Драпковых знаходзілася і фельчар Крупскага фельчарска-акушэрскага пункта Кацярына Агеевіч. Кацярына Міхайлаўна расказала, што ФАП збірае заяўкі ад насельніцтва для вакцынацыі.

— Запісваем усіх ахвотных, затым паведамляем у паліклініку, нам прысылаюць урача з медсястрой. Ахвотных прышчапіцца хапае, бо людзі разумеюць, што трэба берагчыся.

— Звычайнай практыкай стала і тое, што арганізацыі і прадпрыемствы пакідаюць заяўкі ў раённай паліклініцы на вакцынацыю ўсіх ахвотных работнікаў. Урачы выязджаюць і папярэдне праводзяць іх медагляд з мэтай выявіць адсутнасць супрацьпаказанняў. Калі такіх няма, то пасля адпаведных працэдур праводзяць вакцынацыю, — расказала Ала Карпейчык. — Прышчапляюцца розныя катэгорыі насельніцтва: рабочыя, настаўнікі, выхавальнікі дзіцячых садкоў, работнікі культуры. На дадзены момант — расійскімі вакцынамі «Спутник лайт», «Спутник V», кітайскай вакцынай «VERO CELL». Выязджаем па заяўках штодня па будніх днях. Напрыклад, я, як урач-афтальмолаг, пэўны час вяду прыём пацыентаў на рабочым месцы па сваім профілі, а затым едзем у арганізацыі, медыцынскія ўстановы, да людзей дадому, якія не могуць звярнуцца ў паліклініку.

Спачатку грамадзяне Крупскага раёна недаверліва ставіліся да прышчэпак, зрэшты, як і ў іншых рэгіёнах вобласці. Цяпер яны разумеюць, што ёсць неабходнасць у вакцынацыі, бо рызыка захварэць зніжаецца.

— Ускладненняў пасля прышчэпак, як правіла, не назіраецца. На ўсе вакцыны арганізм можа зрэагаваць павышэннем тэмпературы цела да 37–37,2 градуса, якая трымаецца на працягу першых трох сутак, нязначным болем у месцы ўвядзення ін'екцыі, — дзеліцца назіраннямі са сваёй практыкі Ала Міхайлаўна.

Зрабіць прышчэпку можна і ў перасоўным пункце, які працуе ў суботу і нядзелю з 9.00 да 14.00 каля гандлёва-забаўляльнага комплексу «К-сіці». Тут знаходзяцца ўрач і медсястра, якія раскажуць аб прышчэпках і пры жаданні пацыента і адсутнасці супрацьпаказанняў яго вакцынуюць.

Словам, супраць COVID-19 у Крупках змагаюцца ўсёй талакой. Урачы расказваюць аб праўдзе і міфах аб вакцыне супраць каранавіруса, цячэнні хваробы і яе наступствах, праводзяць у калектывах лекцыі. Валанцёры атрада «Добрае сэрца» і медыкі раздаюць інфармацыйныя лісткі, накіраваныя на прафілактыку захворвання шляхам вакцынацыі, ладзяць акцыі пад дэвізам «Толькі разам мы можам перамагчы каранавірус».

З пачатку вакцынацыі ў Крупскай ЦРБ працуе кабінет імунапрафілактыкі № 240 з 8.00 да 16.00 без папярэдняга запісу і чаргі, а таксама кол-цэнтр. Па тэлефоне 5-66-31 медработнікі адказваюць на ўсе пытанні. У раённай бальніцы можна атрымаць сертыфікат аб вакцынацыі на англійскай і рускай мовах, цана якога каля трох рублёў.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## У ТЭМУ

«Гарачыя лініі» па COVID-19 працуюць не толькі ў рэгіёнах Мінскай вобласці. Спецыялісты дзяжураць і на абласной «гарачай лініі». Пытанні можна задаць па тэлефоне 8 (017) 517 20 25. Графік работы — панядзелак — пятніца з 8.00 да 17.00. «Гарачыя лініі» адкрыты таксама ў Мінскім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, куды можна звярнуцца з 8.30 да 16.30 па тэлефонах: 8 (017) 290-00-93, 331 26 14, 331-87-68.

# Падзяка ад мытнікаў

**У РУП «Белтаможсэрвіс» працягваюць праходзіць мерапрыемствы, прысвечаныя 30-годдзю ўтварэння мытнай службы Рэспублікі Беларусь.**



Учора ў цэнтральным офісе прадпрыемства прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання прадстаўнікоў вядучых рэспубліканскіх СМІ. Генеральны дырэктар РУП «Белтаможсэрвіс» Вадзім Бабарыкін выказаў падзяку журналістам за эфектыўнае ўзаемадзеянне, за працу па ўмацаванні іміджу мытнай службы і аператыўнае асвятленне дзейнасці прадпрыемства.

***На здымку:*** падзяку Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь атрымала намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Наталля Крачава. Такія ж узнагароды атрымалі прадстаўнікі тэлеканалаў Беларусь-1, СТБ, Выдавецкага дома «Беларусь сегодня».

# МАМАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не абыдзецца і без традыцыі наведваць з віншавальным візітам у радзільных дамах жанчын, якія нарадзілі дзяцей на працягу Тыдня маці.

Серыю актыўнасцяў рыхтуе і Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў: ушанаванне шматдзетных жанчын, якія сталі сёлета ў чарговы раз маці, віншаванне ардэнаносных, у якіх сем і больш дзяцей, гутарка з сямейным псіхолагам па пытаннях выхавання. Беларускі саюз жанчын зберэ Савет старэйшын аб'яднання, на якім будзе прэзентавана кніга ветэрана жаночага руху.

Ва ўстановах аховы здароўя пройдзе акцыя «Тыдзень без абортаў», а ў час рэспубліканскага круглага стала ў рэгіёнах зацікаўленыя бакі абмяркуюць рэалізацыю ініцыятывы «Бальніца добразычлівых адносін да дзіцяці».

Прыгажосці і феерыі падзеі дададуць установы культуры, дзе запланаваны святочныя канцэрты, літаратурна-музычныя гасцёўні, марафоны, фотачэлендж «10 важных фактаў пра маю любімую маму», флэшмоб «Не забудзь павіншаваць маці!», кінапаказ фільма «Мама», акцыя «Патэлефануйце маме!».

Непасрэдна ў дзень свята — 14 кастрычніка — кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў наведаюць і павіншуюць маці ў шматдзетных сем'ях.

На 15 кастрычніка запланавана падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава». Сямейныя конкурсы пройдуць і ў рэгіёнах — недзе сярод маладых сем'яў, недзе сярод замяшчальных. У асобных кутках Беларусі пры цэнтрах сацабслугоўвання насельніцтва адкрыюцца невялікія «Музеі Маці». Пройдуць выстаўкі і фестывалі сямейнай творчасці.

З-за няпростай эпідэмічнай сітуацыі ў афлайн-праграму могуць уносіцца змяненні. Затое вельмі шмат падзей і ініцыятыў абавязкова будзе рэалізавана анлайн: віртуальныя пляцоўкі для віншаванняў на ведамасных сайтах, конкурсы дзіцячых малюнкаў, размяшчэнне ў сацсетках відэапаштовак, віншавальныя анлайн-марафоны, інтэрнэт-чэленджы і флэшмобы.

## Надвор'е

# Халодныя дажджы, а ўначы — замаразкі

**У гэтыя выхадныя я ездзіў у вёску, закрываў дачны сезон. Сустрэў мяне там ярка-чырвоны куст бружкоў. Ён усім сваім выглядам паказваў — наперадзе ў нас халодны сезон. Так, на гэтым тыдні нас чакаюць істотныя замаразкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А ў аўторак надвор'е будуць фарміраваць малаактыўныя атмасферныя франты. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы.

13 кастрычніка захаваецца ўплыў атмасферных франтоў. У сераду месцамі па краіне, а ўначы па Гомельскай і Магілёўскай абласцях пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах прагназуецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—7 градусаў, на зямлі месцамі ёсць верагоднасць замаразкаў ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень будзе ад 7 да 12 градусаў цяпла.

У чацвер умовы надвор'я будуць вызначацца ўплывам няўстойлівых паветраных мас, якія паступаюць з акваторыі Балтыйскага мора. Месцамі па тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—6 градусаў, на зямлі месцамі слабыя замаразкі ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да 7—12 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных сіноптыкаў, да канца тыдня ў краіне захаваецца ўплыў няўстойлівых паветраных мас, якія прыходзяць да нас з боку Заходняй Еўропы. У асобных раёнах будуць адзначацца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе знаходзіцца ў межах плюс 1—6 градусаў, у асобных раёнах — замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў. Удзень у асноўным будзе ад плюс 8 градусаў да 13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Добрая справа

# ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ



Фота прэс-службы МУС.

Супрацоўнікі міліцыі далучыліся да акцыі «Чысты лес»

**Працоўныя дэсанты падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў па ўсёй краіне ў гэтыя выхадныя дапамагалі лясгасам і гарадскім прадпрыемствам у ліквідацыі несанкцыянаваных звалак, ва ўборцы будаўнічых і бытавых адходаў. Акрамя таго, супрацоўнікі міліцыі, ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў, а таксама курсанты і ліцэісты ведамасных вучэбных устаноў добраўпарадкоўвалі прыдарожныя палосы, лясныя масівы паблізу населеных пунктаў і памятных месцаў.**

Толькі ў Мінску на дапамогу камунальным службам выйшла звыш 700 міліцыянераў. Дэлегацыя цэнтральнага апарата МУС на чале са сваім кіраўніком прыняла ўдзел у азеляненні Кастрычніцкага раёна сталіцы. Дзякуючы іх намаганням недалёка ад перасячэння вуліцы Кіжаватава і МКАД з'явілася больш чым 1700 кустоў гартэнзіі, біручыны і кізільніку.

— Незалежна ад месца службы заўсёды імкнёмся ўдзельнічаць ва ўсіх добрых і патрэбных акцыях, падключаем да іх сем'і, — адзначыў **міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ**. — Супрацоўнікі разумеюць важнасць захавання прыгажосці беларускіх вуліц і праспектаў, таму не толькі забяспечваюць там грамадскі парадак, але і дапамагаюць у іх ператварэнні. Усе грамадзяне нашай краіны павінны акультурваць населеныя пункты, дзе яны жывуць. Мы абавязаны не толькі захаваць усё добрае, што ў нас ёсць, а і прымножыць.

Да акцыі далучылася і Акадэмія МУС. Кіраўніцтва міліцэйскай ВНУ, а таксама афіцэры і курсанты наводзілі парадак, а таксама высаджвалі дрэвы ў розных месцах сталіцы, а таксама на тэрыторыі Мiншчыны.

— Акцыя, у якой Акадэмія МУС заўжды актыўна ўдзельнічае, сёлета асаблівая: яна прымеркаваная да Года народнага адзінства, — падкрэсліў **начальнік ВНУ генерал-маёр міліцыі Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ**. — Калі працоўныя калектывы, грамадскія арганізацыі і самі жыхары мікрараёнаў падключаюцца да агульнай справы — гэта вельмі аб'ядноўвае. За такой зладжанай працай калектыва стаіць жаданне прынесціць карысць роднаму краю.

**Вераніка КАНЮТА.**

Энергетыка

# «УВОД РЭЗЕРВУ АДБЫВАЕЦЦА ЗА СЕКУНДЫ»

## Эксперты пра лічбавізацыю, разумныя электрасеткі і пашпарты для абсталявання

**Лічбавая энергетыка — гэта эканамічнасць, экалагічнасць і высокія стандарты якасці. Па ўзроўні лічбавай трансфармацыі энергетыкі Беларусь лідзіруе сярод краін СНД. Яна стала першай рэспублікай сярод дзяржаў былога СССР, дзе ўкаранілі аўтаматызаваную сістэму кантролю і ўліку электраэнергіі. Пры гэтым дзеля памяншэння колькасці зношаных электрасетак у краіне неабходна штогод мяняць 2700 кіламетраў ліній электраперадачы, на што да 2025 года мяркуецца зрасходаваць каля 1,5 млрд беларускіх рублёў (500 мільёнаў — з рэспубліканскага бюджэту). Пра перспектывы развіцця электрасетак ва ўмовах росту попыту на выкарыстанне электрычнасці на розныя мэты, а таксама лічбавізацыю электраэнергетыкі расказалі эксперты энергетычнай галіны.**



### ПЕРАТОКІ МАГУТНАСЦІ І ЧАСТАТЫ

Сёння лічбавізацыя — тэма не толькі модная, але і надзённая, паколькі з уводам БелАЭС у краіне паўсюдна ажыццяўляюцца пачынанні па павелічэнні спажывання электраэнергіі. У рэспубліканскай энергасістэме рэалізоўваецца некалькі праектаў па лічбавізацыі. Адзін з найбольш цікавых сёння — стварэнне сістэмы аўтаматычнага рэгулявання частаты і ператокаў магутнасці (САРЧМ), заўважыў **начальнік упраўлення аўтаматызаваных інфармацыйна-вымяральных сістэм «Белэнерга» Аляксей КУРЫЛЕНКА**.

Раней, ды і цяпер адной з асноўных задач дыспетчара энергасістэмы з'яўляецца вядзенне рэжыму — падтрыманне сальда ператокаў па магістральных лініях электраперадачы на межах нашай краіны. Гэта ручная работа, бо трэба сачыць за генерацыяй і спажываннем энергіі. Апошняе кожную секунду можа мяняцца на дзясяткі мегават (і гэта ў нармальным рэжыме работы). Падчас аварый могуць знікнуць сотні мегават магутнасці. Каб вытрымаць кантракты на пастаўкі энергіі, дыспетчар мусіў сальда за гадзіну трымаць у пэўных межах, а чалавеку, вядома, уласціва некалькі спазняцца ў разліках. Таму стварылі сістэму, дзе гэтую задачу вырашае машына, расказаў эксперт:

— Для стварэння сістэмы былі мадэрнізаваны сістэмы тэлемеханікі на ўсіх падстанцыях, якія маюць міждзяржаўныя ператокі энергіі. Цяпер інфармацыя пра ператокі электраэнергіі штосекундна паступае ў дыспетчарскі цэнтр «Белэнерга», дзе разлічваецца сальда айчыннай энергасістэмы і параўноўваецца з планавым значэннем. Такім чынам, мы будзем гатовы аддаваць заданні на генерыруючыя крыніцы, якія будуць падключаны ў САРЧМ, што дазволіць вытрымліваць жорсткія патрабаванні па адхіленні сальда ператокаў і пазбегнуць штрафных санкцый па пастаўках энергіі, — тлумачыць Аляксей Курыленка.

Яшчэ адна задача САРЧМ — падтрыманне частаты. Гэта пытанне бяспекі і ўстойлівасці энергасістэмы ў цэлым. Вядома, што турбіна павінна рабіць 3000 абаротаў за хвіліну і выдаваць у энергасістэму частату 50 Гц. Самае нязначнае адхіленне вядзе да памяншэння ўстойлівасці энергасістэмы, а калі пагрэшнасць стане 1-2 ГЦ, то энергасістэма проста падзеліцца на некалькі складнікаў і энергазабеспячэнне спыніцца.

### СІМ-МАДЭЛЬ

Айчынныя энергетыкі восьвось скончаць стварэнне цэнтральнай каардынацыйнай сістэмы. Летась і сёлета на 4-м і 9-м энергаблоках Лукомльскай ГРЭС праводзілі выпрабаванні адносна магчымасці рэгулявання блокаў з цэнтральнага пункта «Белэнерга». На чарзе — выпрабаванні на Гомельскай ЦЭЦ-2 і Бярозаўскай ГРЭС. Плануецца, што ў лістападзе-снежні ўжо пачнецца доследная эксплуатацыя ў аўтаматызаваным рэжыме двух блокаў Лукомльскай ГРЭС, паведаміў Аляксей Курыленка.

Працуюць у галіне і над стварэннем лічбавай платформы аўтаматызаванай сістэмы тэхналагічнага кіравання (АСТУ) аб'ектамі энергасістэмы, прынцып работы якой эксперт патлумачыў у параўнанні з работай камп'ютара:

— За 25 гадоў, на працягу якіх масава распаўсюдзіліся камп'ютары, у энергасістэме з'явілася мноства дадаткаў, кожны з якіх вырашае ўласную задачу. Гэтыя праграмныя комплексы працуюць з пэўнай структурай энергасістэмы. Схема сеткі мяняецца штогод у прынцыпе, а ў межах будаўніцтва АЭС схема сістэмаўтваральнай сеткі змянілася яшчэ больш сур'ёзна. А кожнае такое змяненне патрабуе ўнясення змен у кожную асобную праграму. І ў гэтым працэсе вельмі высокая верагоднасць памылкі чалавека. Каб пазбегнуць гэтага, гадоў з дзесяць таму Міжнародная электратэхнічная камісія прапанавала стварэнне агульнай інфармацыйнай мадэлі — СІМ-мадэлі, як яе называюць энергетыкі. Гэта калі па адных і тых жа законах апісваецца поўнасцю ўся энергасістэма, а праграмны комплекс, які выкарыстоўваецца для вырашэння розных задач (размеркавання, адключэння, рамонту), абапіраецца на адну гэтую СІМ-платформу. Такім чынам, у ідэале пры любым змяненні ў адным пэўным месцы ўвесь праграмны комплекс адразу будзе ведаць пра гэтыя змены.

### ЛІНІІ ЭЛЕКТРАПЕРАДАЧЫ Ў ПЛАНШЭЦЕ І НА ВІДЭАКУБАХ

У электрасеткавым комплексе беларускай энергасістэмы ўсталявана больш за 63 тысячы прылад рэлейнай абароны і аўтаматыкі. Каля 40 % з іх створана на мікрапрацэсарнай і мікраэлектроннай элементнай базе. Галоўная задача аўтаматызацыі размеркавальнай сеткі — аператыўная лакалізацыя аварыйнага ўчастка, а вядучая роля ў яе вырашэнні належыць рэклоўзеру, які забяспечвае аўтаматызацыю і кіраванне лініямі электраперадачы на якасна новым узроўні. Ён аб'ядноўвае ў сабе практычна ўсе віды супрацьаварыйнай аўтаматыкі. З укараненнем рэклоўзера сетка становіцца больш гнуткай — пашкоджанне ў ёй не аказвае ўплыву на большасць спажыўцоў. Рэканфігурацыя адбываецца аўтаматычна, інфармацыя апрацоўваецца лакальна і выдаецца дыспетчару для прыняцця рашэння. А вызначэнне пашкоджання і ўвод рэзерву адбываецца за секунды, кажуць энергетыкі.

Пілотныя праекты па аўтаматызацыі электрасетак адбываюцца цяпер на прадпрыемствах «Мінскія кабельныя сеткі» і «Гомельскі гарадскі РЭС». Тут будзе ўкараняцца праграмнае забеспячэнне, якое першапачаткова падтрымлівае тэхналогію СІМ-мадэлі. Па выніках укаранення гэтых праектаў, магчыма, і будзе выпрацаваны агульны падыход па патрабаваннях да таго праграмнага забеспячэння, якое будзе пасля маштабавана на ўсю энергасістэму.

На працягу апошніх двух гадоў у краіне ўкараняецца адзіная аўтаматызаваная геаграфічная інфармацыйная сістэма — «Геагіс». Гэта алічбоўка ўсіх ліній электраперадачы з магчымасцю нанясення іх на геаграфічную падложку. Пасля гэтага ў ідэале энергетыкам не трэба будзе думаць, дзе што знаходзіцца тэрытарыяльна. Дастаткова ўзяць планшэт і ледзьве не па навігатары рухацца да патрэбнай апоры лініі.

А вось інфармацыйна-графічная сістэма «Цяплограф» дазваляе цалкам вырашыць задачу пашпартызацыі сетак і абсталявання на базе маштабнага графічнага прадстаўлення на плане мясцовасці. Яна здольная аператыўна шукаць аб'екты па розных крытэрыях, выкарыстоўваць графічныя і таблічныя метады аналізу даных, разлічваць гідраўлічныя рэжымы, лакалізаваць пашкоджанні цепласетак, мадэліраваць перспектыўныя варыянты развіцця сістэмы цеплазабеспячэння, заўважылі эксперты галіны.

У спадчыну з часоў СССР энергетыкам дастаўся мазаічны шчыт, дзе ў выглядзе мнемасхемы, па сутнасці — набору ліній, адлюстроўваліся энергааб'екты. За апошнія гады галіна пераходзіць да сістэмы калектыўнага адлюстравання на відэакубах ці LED-панэлях. Гэта дазваляе дыспетчару па-іншаму прадстаўляць інфармацыю і прымаць рашэнні, дадаў Аляксей Курыленка. Сэрца цяперашняй беларускай энергасістэмы — галоўны энергетычны дыспетчарскі шчыт, з якога пастаянна кіруюць энергасістэмай, каб забяспечыць яе беспрабойную дзеяздольнасць у краіне, а таксама паралельную работу з энергасістэмамі сумежных краін.

### ЁСЦЬ ЦЭНТРАЛІЗАВАНЫ ГАЗ — ЭЛЕКТРААЦЯПЛЕННЯ НЕ ЧАКАЙЦЕ

Працягласць электрасетак у Беларусі налічвае звыш 278 тысяч кіламетраў. Пры гэтым крыху больш за палову з 244 тысяч кіламетраў ліній электраперадачы напружаннем 0,4—10 кВ у краіне зношаныя. Адпрацавалі свой тэрмін службы і 38 % з 34 тысяч кіламетраў ліній напружаннем 35—750 кВ. Таму перад энергетыкамі стаіць задача па памяншэнні зносу электрасетак, павышэнні надзейнасці іх электразабеспячэння, а таксама павелічэнні прапускной здольнасці, нагадаў **начальнік упраўлення стратэгічнага развіцця «Белэнерга» Андрэй НЯГОДЗКА**:

— З 2021 да 2025 года прадугледжана будаўніцтва і рэканструкцыя каля 12 тысяч кіламетраў паветраных ліній электраперадачы напружаннем 0,4—10 кВ, каля 600 кіламетраў — напружаннем 110 кВ, каля 530 кіламетраў — напружаннем 330 кВ. Запланавана таксама будаўніцтва падстанцый: напружаннем 750 кВ — адна, 330 кВ — восем, 110 кВ — 27 штук. Асаблівая ўвага пры гэтым будзе ўдзяляцца магчымасці стварэння ўмоў для павелічэння спажывання электраэнергіі на ацяпленне, гарачае водазабеспячэнне і гатаванне ежы.

За выдачай тэхнічных умоў (ТУ) на выкарыстанне электрычнасці на гэтыя мэты сёлета ў энергазабяспечвальныя арганізацыі звярнулася каля 15 тысяч чалавек. 82 % з іх дакументы атрымалі, астатнім адмовілі.

— Найперш гэта абумоўлена абмежаванай прапускной здольнасцю электрасеткі. Хоць спецыялісты энергасістэмы пры звароце грамадзян вядуць дэталёвы аналіз электрасеткі і вызначаюць тэхнічную магчымасць падключэння любога жылога дома і іх электрапрыёмнікаў да электрасеткі. Пры адмове ў выдачы ТУ гэтая інфармацыя ўлічваецца пры планаванні рэканструкцыі электрасетак, — запэўніў эксперт.

Мадэрнізацыя сетак, якія аджылі свой век, адбываецца адпаведна з планам-графікам і за дзяржаўны кошт. Аднак тыя, хто хоча займець электрычнасць для ацяплення, падагрэву вады і гатавання раней, змогуць фінансава паўдзельнічаць у аплаце работ па рэканструкцыі яшчэ не зношаных (незамартызаваных) электрасетак. На днях прыняты Указ № 381, які дазволіць грамадзянам аб'ядноўвацца ў спажывецкія кааператывы і згуртавана ўдзельнічаць у рэканструкцыі электрасетак, укладваючы ў гэта да 30 % ад кошту рэканструкцыі, удакладніў Андрэй Нягодзька.

Аднак у мястэчках, дзе дамы падключаны да цэнтралізаванай сістэмы забеспячэння прыродным газам, электрычнасць для падагрэву вады ніколі не будзе выкарыстоўвацца. Двойчы ўкладваць дзяржаўныя грошы ў наладжванне інфраструктуры няправільна, нагадалі эксперты.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Ну і ну!

# ХАЦЕЛА ЗАВАЛОДАЦЬ КВАТЭРАЙ

## Юрысконсульт падрабіла завяшчанне памерлага ўладальніка

**У Мазырскі РАУС звярнулася кіраўнік аднаго з сельскіх выканаўчых камітэтаў раёна. Яна распавяла, што да яе прыйшла мазыранка, якая хацела завізіраваць заднім чыслом завяшчанне. Дакумент даваў права жанчыне стаць уласніцай трохпакаёвай кватэры коштам больш за 80 тысяч рублёў. Падрабязнасці гэтай гісторыі паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гомельскага аблвыканкама.**

Яна патлумачыла, што год таму пры афармленні на дакуменце папросту забыліся паставіць подпіс, а заўважыла яна гэта толькі цяпер. Кіраўнік сельвыканкама западозрыла нядобрае і звярнулася да праваахоўнікаў.

Аператыўнікі аддзялення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі высветлілі, што жанчына, працуючы на пасадзе юрысконсульта аднаго з раённых дзяржаўных прадпрыемстваў, мела доступ да інфармацыі аб даўжніках за камунальныя плацяжы. Так яна даведалася пра жыхарку Мазыра, якая некаторы час таму памерла. Родных у яе не было, а камуналка не аплачвалася працяглы час.

Даведаўшыся пра гэта, юрысконсультант вырашыла завалодаць «безгаспадарнай» кватэрай. Для гэтага яна падрыхтавала завяшчанне, дзе ўласнаручна распісалася за памерлую. Пасля гэтага знайшла сведку сярод знаёмых, які за невялікае ўзнагароджанне пагадзіўся пакінуць свой подпіс на паперы. А ў далейшым падрабіла пячатку сельскага выканаўчага камітэта, дзе нібыта быў зарэгістраваны дакумент. Факты падробкі подпісу і пячаткі пацвердзілі эксперты.

Ад валодання кватэрай жанчыну аддзяляў толькі подпіс кіраўніцтва сельвыканкама. Усе планы разбурыў пільны дзяржаўны служачы.

Следчы камітэт па факце махлярства ў асабліва буйным памеры завёў крымінальную справу. Вядзецца следства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Запрашальнік

# Простыя сюжэты Бутры

**У Мінску адкрылася выстаўка чорна-белай аналагавай фатаграфіі**

**Выстаўка фатаграфіі Віктара Бутры «Простыя сюжэты. Частка 2» адкрылася ў Мемарыяльным музеі-майстэрні Заіра Азгура.**



Музей працягвае знаёміць гледача з беларускай фатаграфіяй XX стагоддзя ў рамках праекта «Археалогія беларускай фатаграфіі». Выстаўка Віктара Бутры з'яўляецца працягам першай часткі экспазіцыі «Простыя сюжэты». Гэта рэдкія і вінтажныя адбіткі чорна-белых здымкаў 1960—1990-х гадоў. Яны не заўсёды тэхнічна дасканалыя, але дэманструюць у сабе асаблівы аўтарскі погляд на рэальнасць.

Гэты праект прадстаўляе серыю чалавечых гісторый, зафіксаваных на фотапаперы. Гэта ціхія і сціплыя па сваім гучанні, але пры гэтым візуальна багатыя і напоўненыя глыбокім сэнсам фотакарткі, якімі так шчодра дзеліцца з намі адзін з самых праніклівых і зоркіх фатографаў Беларусі.

Як адзначаюць арганізатары, папярэдняя выстаўка Віктара Бутры «Простыя сюжэты» праходзіла ў Мінску ў 2004 годзе і выклікала вялікі рэзананс. Экспанаваныя тады работы надзейна прапісаліся ў многіх важных публікацыях, уключаючы энцыклапедыю «Гісторыя еўрапейскай фатаграфіі», і знайшлі сваё месца ў музейных калекцыях «Расфота» ў Санкт-Пецярбургу, Музеі фатаграфіі ў Літве і Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь.

Вядомы беларускі фатограф Віктар Бутра нарадзіўся ў 1944 годзе. Стваральнік культавых і эмблематычных для беларускага фотамастацтва работ рэдка праводзіць персанальныя выстаўкі. Майстар дагэтуль любіць працаваць з аналагавай фатаграфіяй, а не з лічбавай, паколькі, паводле яго слоў, яна мае шматгадовую вытрымку і яе якасць праверана часам.

Выстаўка будзе працаваць да 30 кастрычніка.

## Міхаіл ЛЯЎКОВІЧ:

# «КОЖНУЮ КАРЦІНУ Я «ПРАХОДЖУ» ДУШОЙ»



**Прывабнасць мастацтва ў тым, што яно ніколі не пакідае раўнадушным. Кожны знойдзе для сябе нешта цікавае: карціны, якія западаюць у самае сэрца, незвычайныя лёсы мастакоў... На адной выстаўцы можна цалкам адчуць бязмежную сілу чалавечага таленту і твораў, якія ён нараджае. «Звязда» разам з галерэяй «АртХаос» вырашылі пазнаёміць усіх з гэтай сілай.**

Жыццёвы і творчы лёс (калі, канешне, гэтыя паняцці можна раздзяляць) Міхася Ляўковіча падобны на сцэнарый фільма, у якім галоўны герой, пераадольваючы ўсе перашкоды, слухаючы сэрца, ідзе да сваёй мэты. Вядомы мастак-акварэліст, выкладчык рэалістычнага жывапісу, сёння алеем піша абстракцыі. Аднак пра ўсё па парадку.

### ЛЫЖЫ, ЗАВОД, АРМІЯ

Нарадзіўся Міхась Ляўковіч у вёсцы Язна Мёрскага раёна. З дзяцінства марыў быць мастаком, бацькі творчыя здольнасці сына падтрымлівалі. «Я доўга ўпрошваў тату купіць мне лыжы. Пакуль аднойчы да яго не прыйшоў сябар. І бацька сказаў: калі добра намалюю дзядзьку Факстрота (цікавая мянушка), то купіць лыжы. А ў яго такая знешнасць выразная была, ну я і намаляваў. Бацька слова стрымаў. Так я зарабіў свой першы ганарар», — успамінае Міхаіл Васільевіч.

Нягледзячы на ўвесь творчы патэнцыял, удзел у гуртках фатаграфіі і малявання, літаратурна-тэатральным, пасля восьмага класа хлопец вырашае за кампанію з сябрам паступаць у нафтавы тэхнікум. «Мне ўсе настаўнікі ў адзін голас казалі «Міша, не тваё». Ну куды там, мы ж максімалісты, як і кожнае маладое пакаленне. Таму сёння я спакойна стаўлюся да моладзі, якая не прымае парады. Кожны павінен сам звaліцца на зямлю, каб адчуць, што яна цвёрдая. Паступаю ў тэхнікум, нас вядуць на тэхнічную тэрыторыю, а людзі там усе ў нафце, у мазуце, мурзатыя. Праз месяц зразумеў, што гэта не маё, забраў дакументы і вярнуўся ў школу. Дырэктар сустракаў як блуднага сына», — расказвае Міхаіл Ляўковіч.

Мара стаць мастаком аказалася мацнейшай за ўсё. Але на той час паступіць на мастацка-графічны факультэт Віцебскага ўніверсітэта было вельмі няпроста. Аднаго прыроднага таленту аказалася недастаткова — патрэбна была адпаведная падрыхтоўка. Напісанае на тройку сачыненне падчас уступных іспытаў перашкодзіла стаць студэнтам і давялося стаць салдатам. Як расказвае Міхаіл Васільевіч, менавіта ў войску выпаў шанц раскрыць творчыя здольнасці: «У арміі мяне прызначылі мастаком у Дом афіцэраў. А маім камандзірам быў капітан Чуян, выпускнік Разанскага мастацкага вучылішча. Я служыў у вельмі маляўнічых Карпатах, а капітан кожныя выхадныя вадзіў нас на эцюды. І ў войску я ўпершыню ўбачыў класны набор ленінградскіх акварэльных фарбаў і пэндзлі. Іх я і сёння захоўваю. Капітан казаў, што «Ляўковіч з лёту схоплівае». Калі сам стаў выкладчыкам, зразумеў, як добра, калі чалавек гатовы ўсмоктваць інфармацыю». З арміі ён прывёз даведку аб заканчэнні двухгадовага курса ў студыі выяўленчага мастацтва, дзе аваладаў рознымі дэкаратыўна-прыкладнымі навыкамі. Але ўступныя іспыты ва ўніверсітэт да гэтага часу ўжо скончыліся, і прыйшлося ўладкавацца мастаком-афарміцелем на наваполацкі завод «Палімір». Аднак думка пра адукацыю не пакідала: «Кіраўніцтва вырашыла адправіць мяне на курсы павышэння кваліфікацыі мастакоў-афарміцеляў і пасля зрабіць намеснікам начальніка вытворчасці па эстэтыцы. Але лёс распараджаецца інакш, я добра здаю іспыты ў Віцебску. Нават сачыненне на выдатна напісаў, у арміі перапісаў безліч дакладаў, пастаноў пленумаў ЦК КПСС і візуальна запомніў, дзе якія знакі прыпынку ставіць, як словы правільна пішуцца. Так я стаў студэнтам мастацка-графічнага факультэта. Вучыцца мне было лёгка і цікава. Асабліва добра даваўся акварэльны жывапіс. За адзін сеанс заняткаў, а гэта чатыры гадзіны, па чатыры эцюды рабіў».

Падчас размеркавання кіраўніцтва ўніверсітэта не захацела адпускаць здольнага выпускніка. Так учарашні студэнт стаў выкладчыкам кафедры выяўленчага мастацтва. «Для мяне гэта было як гром сярод яснага неба. Практычны вопыт у мяне адсутнічаў. А факультэт багемны, студэнты асаблівыя. Мне вельмі пашчасціла са старэйшымі калегамі. Маімі настаўнікамі былі вядомыя мастакі Віцебскай школы — Алег Арлоў, Леанід Анцімонаў, Іван Сталяроў, Альберт Някрасаў, Аляксандр Гаўрушка. Школа была вельмі моцная. На кафедры ад мяне патрабавалі ўзяцца за кандыдацкую дысертацыю. І аднойчы на пасяджэнні я падняўся і сказаў, што перапісванне чужых думак не лічу навукай, таму дысертацыю напішу гадоў у 60, калі набяруся вопыту і адчую патрэбнасць ім падзяліцца. Былі малады, зялёны, але цвёрда вырашыў, што буду развівацца ў прафесійным кірунку», — расказвае Міхаіл Васільевіч.



### ПАМІЖ ФІЗІКАЙ І ЛІРЫКАЙ

Творчая кар'ера ў Міхаіла Ляўковіча пачалася менавіта з акварэлі. Майстэрні тады не было, а працаваць у кватэры з акварэльнымі фарбамі больш зручна, чым з алеем. Кар'ера развівалася, і ў 1995 годзе Міхаіла Ляўковіча абіраюць старшынёй суполкі «Віцебская акварэль». І закруцілася: рэспубліканскія і міжнародныя выстаўкі, праекты, сустрэчы з калегамі. Але сумяшчаць мастацкую і менеджарскую працы аказалася няпроста: «Мае сябры, блізкія казалі мне, што я самадастковы мастак і мне трэба займацца мастацтвам, творчасцю. А я заўсёды быў за калектыў, ініцыяраваў новыя праекты. Але сумяшчаць гэта было вельмі цяжка. І ў 2011 годзе я сышоў з пасады старшыні суполкі, стаў больш часу ўдзяляць працы». Мастак расказвае, што адрозніваўся ад калег тым, што акварэльныя эцюды пісаў алеем, а потым пераапрацоўваў іх акварэллю. І гэта давала свой плён, змена матэрыялу ўзбагачала працу. Алей дазваляе балансаваць колерам, адценнямі. Акварэль дапаўняе тэхнічныя магчымасці.

У 2015 годзе мастак прымае рашэнне скончыць выкладчыцкую дзейнасць, нягледзячы на слёзы студэнтаў і супраціўленне кіраўніцтва. Выкладанне патрабавала мноства сіл і энергіі, неабходных у творчасці. Міхаіл Васільевіч прызнаецца, што, сышоўшы з выкладчыцкай дзейнасці, адчуў, што такое воля: «Зараз я вельмі імкліва працую. Я не ведаю, колькі часу мне адвёў стваральнік, таму кожны дзень стараюся правесці з карысцю». А сыход быў знакавы. Разам са студэнтамі мастак арганізаваў незвычайную выстаўку. Кожны абраў для сябе музычны твор і паспрабаваў прадставіць яго на палатне.

З'яўляючыся выкладчыкам рэалістычнага мастацтва, Міхаіл Ляўковіч імкнуўся ўласным творчым прыкладам дэманстраваць студэнтам, што гэта такое. Прыводзіў іх у сваю майстэрню, каб паказаць, да каго яны прыйшлі вучыцца. Абстрактныя творы пісаліся «ў стол». Тым больш што ў савецкі час гэты кірунак не вельмі паважалі ці проста не разумелі. З 1990-х гадоў Міхаіл Ляўковіч выкарыстоўвае ў сваіх карцінах абстрактныя элементы, але не выстаўляе іх на першы план. Дазваляў ён і студэнтам адыходзіць ад фармальнай праграмы ці, кажучы мовай мастацтва, тварыць.

### ІСЦІ НАПЕРАД, НЕ ГЛЕДЗЯЧЫ НАЗАД

Як абстракцыяніст Міхаіл Ляўковіч заявіў аб сабе выстаўкай «Другое дыханне», якая прайшла ў Віцебску ў 2017 годзе. Яе мастак называе праверкай сіл: «Я зразумеў, што трэба ісці наперад, не паварочваючы галавы назад. Толькі так можна адкрыць нешта новае, у першую чаргу, у сабе самім. І вось гэтае інтуітыўнае адчуванне, што я затрымаўся ў адным жанры, прывяло мяне ў абстракцыю».

**«Аднойчы на пасяджэнні я падняўся і сказаў, што перапісванне чужых думак не лічу навукай, таму дысертацыю напішу гадоў у 60, калі набяруся вопыту і адчую патрэбнасць ім падзяліцца».**

Свой кірунак у абстракцыі Міхаіл Васільевіч называе лірычным абстракцыянізмам. «Калі мяне напаўняюць нейкія эмоцыі, перажыванні, я пракручваю кампазіцыю, дэталі будучай карціны. У майстэрні ляжыць стос аркушаў, гэта мой нататнік, архіў. Там можна знайсці любы далёкі год мінулага стагоддзя. Я наўмысна не прыбіраю, жонка прапаноўвала, але я не даю. Гэты беспарадак — мой парадак, там мае пачуцці, эмоцыі. Абстракцыя — гэта пачуцці, якія складаюць свет мастака. І ён праз сімвалы, розныя віды абстракцыі даносіць да гледача пэўны настрой», — тлумачыць творца. Але Міхаіл Васільевіч папярэджвае, што глядач павінен быць да гэтага падрыхтаваны, разумець мастацтва і паважаць яго правілы.

Міхаіл Ляўковіч падкрэслівае, што за апошнія гадоў 20 стаўленне да абстрактнага жывапісу змянілася ў лепшы бок. Усё больш такіх карцін прадстаўлена на розных выстаўках. І таму, па яго словах, узрастае і адказнасць творцы. «Кожны мастак нясе адказнасць перад сабой, стваральнікам, гледачамі. І ў кожнага павінны быць межы эстэтычнага, духоўнага. Унутры мяне яны ёсць. Не бяруся сябе хваліць, але кожную карціну я «праходжу» душой», — расказвае Міхаіл Ляўковіч.

### ДУМКАМІ — У КАРЦІНЕ

Мабыць, няма больш суб'ектыўнай і асабістай для ўспрымання рэчы, чым абстрактнае мастацтва. Аднак карціны Міхаіла Ляўковіча, якіх бы колераў і адценняў ні былі, вельмі цёплыя, літаральна выпраменьваюць цяпло. «На выстаўцы ў Франкфурце-на-Майне я прадстаўляў нізку карцін, прысвечаных маім продкам. І людзі па некалькі разоў прыходзілі паглядзець на партрэт бабулі Наталлі, казалі, што яна выпраменьвае цяпло. Відаць, таму што зроблена з глыбокай любоўю і пашанай. У тым жа горадзе выстаўляў партрэт вясковага скрыпача, мужчыны ў простай кашулі. І калі мне сказалі, якую суму прапанавалі за гэты партрэт, у мяне ногі падкасіліся», — расказвае Міхаіл Васільевіч.

Такую асаблівасць сваіх твораў мастак звязвае са сваім настроем і стаўленнем да справы: «Я вельмі грунтоўна падыходжу да працы. Усё абдумваю, рыхтуюся. За мяжой у мяне аднойчы спыталі, колькі часу я працаваў над карцінай. А я спытаў, колькі часу алімпійскі чэмпіён ідзе да перамогі — усё жыццё і, магчыма, пяць хвілін. Калі я стаю каля мальберта, для мяне час не існуе. Фізічна я тут, у майстэрні, а ў думках — там, у карціне. Магчыма, гэта накладваецца адно на адно, і такім чынам атрымліваецца дастукацца да гледача». Міхаіл Васільевіч прызнаецца, што не ведае, хто ці што кіруе рукой мастака падчас працы. Плануецца адно, а на палатне ўзнікае зусім іншае. І, магчыма, у гэтым і прывабнасць мастацтва як для гледача, так і для творцы: «Я ўжо пераканаўся, што намаляванае на злобу дня ніколі му не патрэбнае і праз час будзе забыта. Кожная эпоха, кожнае пакаленне мела сваіх мастакоў, пісьменнікаў, творцаў. І некаторыя засталіся геніяльнымі. А некаторыя — не. Я не ведаю, якую адзнаку дасць стваральнік маёй творчасці. Неяк дачка спытала, чаго я дасягнуў у жыцці. Я стаў мастаком, мае работы прадстаўлены па ўсім свеце, а гэта след, які б ён ні быў».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

## ВТБ ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2021 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2021 год | 2020 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 37 644 | 58 292 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 703 970 | 578 111 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 91 778 | 174 625 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 171 549 | 16 158 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 150 199 | 1 120 699 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 1 250 | 70 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2 297 | 2 297 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 58 638 | 53 558 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 979 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 2 260 | 7 649 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | 319 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 18 769 | 22 886 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 2 239 333 | 2 034 664 |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 44 689 | 12 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 26 289 | 37 090 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 1 725 365 | 1 651 089 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 70 806 | 7 177 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 350 | 72 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 38 330 | 41 809 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 905 829 | 1 737 249 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 117 562 | 117 562 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 3 432 | 3 432 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 15 765 | 13 791 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 27 017 | 31 082 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 169 728 | 131 548 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 333 504 | 297 415 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 2 239 333 | 2 034 664 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2021 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2021 год | 2020 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 110 559 | 93 201 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 66 713 | 54 231 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 43 846 | 38 970 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 55 183 | 61 683 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5 121 | 4 980 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 50 062 | 56 703 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 846 | (152) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 8 750 | 1 454 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4 222 | 11 743 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 21 041 | 1 018 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 25 755 | 5 565 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 65 138 | 63 174 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 466 | 3 099 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 44 836 | 46 992 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 8 747 | 14 353 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 36 089 | 32 639 |

**Председатель Правления** **С.В. Суслопаров**

**Главный бухгалтер** **Л.Д. Левданская**

**Дата подписания: 05 октября 2021 г.**

**Финансовая отчетность на 1 октября 2021 года в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: www.vtb.by**

УНП 101165625


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего ООО «Юрстайл групп» (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404) проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании определения Экономического суда Минской области от 30.07.2021 по делу № 290-17Б/2019 повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества ДУП «Передвижная механизированная колонна № 185» УП «Минскоблсельстрой» (222410, Минская область, г. Вилейка, пос. Чапаева, 50, УНП 690018995) в составе:**

• **ЗДАНИЕ МАСТЕРСКИХ С БЫТОВЫМИ ПОМЕЩЕНИЯМИ** *(составные части и принадлежности: 2 склада, трансформаторная подстанция, 2 покрытия, 2 забора, электрические сети)*, **инв. № 631/С-14025, общей площадью 872 кв. м**

• **ЗДАНИЕ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННОЕ АВТОМОБИЛЬНОГО ТРАНСПОРТА – ЗДАНИЕ ГАРАЖА НА 10 АВТОМАШИН, инв. № 631/С-14024, общей площадью 554,8 кв. м (далее – Объект).**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 621350100001000428 площадью 1,1173 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Поселок Чапаева, 50.

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, площадь 0,0135 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, площадь 0,1496 га.*

Начальная цена без НДС – **571 500,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **57 150,00** бел. руб.). *Начальная цена снижена 10 %).*

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 18.08.2021.

Аукцион состоится **28.10.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.10.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефоны для осмотра: (8029) 687 59 23, (8017) 396 61 34.**

УНП 690018995

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)* по поручению ОАО «Солигорскторг» *(продавец)***

**проводит повторный открытый аукцион по продаже**

## ПОМЕЩЕНИЯ МАГАЗИНА № 34

*(составные части и принадлежности: пристройка из металлопрофиля с металлической крышей, навес с ж/бетонной крышей на металлических столбах, рампа бетонная с ж/бетонным навесом на металлических столбах, крыльцо бетонное)*

**с инв. № 644/D-30188 общей площадью 770,7 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Козлова, 58А,**

## И СИСТЕМЫ АВТОМАТИЧЕСКОЙ ПОЖАРНОЙ СИГНАЛИЗАЦИИ

**(инв. № по бух. учету 34-169).**

**Сведения о земельном участке: кадастровый номер 625050100001002601, площадь 0,2459 га, доля в праве – 11/50.**

**Начальная цена с НДС (20 %)** – **534 144,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **53 414,40** бел. руб.). *(Цена снижена на 35 %).*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата производится в следующем порядке:

- 40 (сорок) процентов стоимости имущества оплачивается в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 60 (шестидесяти) процентов – в течение 3 (трех) календарных месяцев (по 20 %) с учетом ежемесячной индексации цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь, либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона (Объекта).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 19.05.2021, 01.07.2021, 17.08.2021.

Аукцион состоится 25.10.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.10.2021 до 16.00 по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 029 136-31-11.**

УНН 600122715

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

**Государственным предприятием**

## «БелЮрОбеспечение» (192821149)

**назначено проведение электронных торгов:**

| | |
|---|---|
| Организатор | Общество с ограниченной ответственностью «Громар» |
| Предмет | Лот № 9.2021.11.00009. Готовый бизнес ООО «Громар» и ООО «Августовский бекон» |
| Место нахождения | Гродненский район г. п. Сапоцкин, ул. Вильчинского, 38А |
| Начальная стоимость | 1 920 000,00 белорусских рублей без НДС |

**Торги будут проведены 02.11.2021 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 01.11.2021.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ОРС Гомель» (арендодатель) извещает о проведении 3 ноября 2021 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование и адрес лота | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС 20 % | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 407,7 кв. м**, изолированное помещение с инв. № 340/D-210313 с составными частями и принадлежностями (здание магазина – 72,4 кв. м; крыльцо – 2,2 кв. м; сарай кирпичный, инв. № 4100292 – 67,0 кв. м; асфальтовое покрытие, инв. № 4100294 – 266,1 кв. м), назначение – административное помещение, наименование – **помещение магазина № 45**. Коэффициент спроса – 3,0 (основное строение и сарай). Коэффициент спроса – 0,5 (асфальтовое покрытие). Базовая ставка – 0,1. Коэффициент местоположения – 0,6. Арендная плата в месяц – **33,471** базовой арендной величины (с учетом НДС 20 %). **Адрес:** Гомельская обл., Речицкий р-н, Бабичский с/с, ст. Бабичи. **Цель использования:** розничная торговля. **Срок аренды – 3 (три) года** | **1 033,52** | 1 033,52 |
| **Сведения о продавце** | ОАО «ОРС Гомель», г. Гомель, ул. Калинина, 14. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 173-57-21 – Лызова Виктория Евгеньевна** | | |
| **Срок подачи заявления** | **с 12.10.2021 г. по 01.11.2021 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» **(предварительно по контактным телефонам Организатора торгов)**. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) | | |
| **Размер штрафа** | **Лот № 1 – 11 (одиннадцать) базовых величин,** согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству) | | |

**Шаг аукциона – 10 (десять) %.**

**К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона): в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет Арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка; в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола оплатить Организатору аукциона по результатам аукциона вознаграждение в размере **10 (десяти) % от цены продажи Объекта** (вознаграждение оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка РБ на дату подписания протокола о результатах аукциона), а также затраты на публикацию извещения в газете «Звязда» от 12.10.2021 г. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www. expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 8 (029) 651-22-19, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

Газета — чытач

# ШТО ЗАСТАНЕЦЦА ПАСЛЯ...

## Пытанні спадчыны — адны з самых складаных. Дапамагаем нашым чытачам разабрацца разам са спецыялістам

**Паводле статыстыкі, жанчыны жывуць даўжэй за мужчын. З сыходам спадарожніка жыцця, акрамя болю страты, удава застаецца сам-насам з многімі практычнымі пытаннямі. І, бадай, самае балючае — пытанне спадчыны. Каму цяпер належыць маёмасць, якую яна лічыла сваёй?..**

### Дом і зямля

*Валянціна Іванаўна з Жодзіна нядаўна пахавала мужа. Ёй далёка за семдзесят гадоў. Завяшчання муж не пакінуў. І цяпер жанчына трывожыцца, ці належаць ёй па законе іх дом і зямельны ўчастак. З гэтым пытаннем наша чытачка звярнулася ў любімую газету.*

— Грамадзянскім заканадаўствам прадугледжаны два віды атрымання ў спадчыну — па законе і па завяшчанні. Наследванне па законе мае месца толькі тады, калі завяшчанне адсутнічае або вызначае лёс не ўсёй спадчыны, а таксама ў некаторых іншых выпадках. Да спадчыннікаў першай чаргі належаць дзеці, сужэнец і бацькі спадчынадаўца, якія наследуюць у роўных долях. Спадчыннікі кожнай наступнай чаргі маюць права на атрыманне ў спадчыну ў выпадку адсутнасці спадчыннікаў папярэдняй чаргі, ухілення іх ад спадчыны, непрыняцця імі спадчыны або адмовы ад яго, — тлумачыць **адвакат Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена ГРОНСКАЯ.**

Наша чытачка, законная жонка, з'яўляецца спадчыннікам першай чаргі пасля смерці мужа, такім чынам, атрымлівае ў спадчыну ў роўных долях сумесна з іншымі спадчыннікамі першай чаргі — у дадзеным выпадку з дзецьмі памерлага, кажа адвакат. Але варта ведаць, што маёмасць, нажытая мужам і жонкай за гады сумеснага жыцця, з'яўляецца іх сумеснай уласнасцю, незалежна ад таго, на каго (мужа ці жонку) яна была набыта і хто з іх уносіў грошы. Пасля смерці аднаго з сужэнцаў атрымаць у спадчыну можна толькі маёмасць, якая складае долю памерлага, а гэта адна другая. Такім чынам, менавіта доля памерлага з'яўляецца спадчыннай маёмасцю і атрымліваецца ў роўных долях спадчыннікамі першай чаргі.

Валянціну Іванаўну хвалюе, што зямельны ўчастак, некалі выдзелены сям'і сельсаветам саўгаса «Заранча», муж хацеў прыватызаваць, але не паспеў пачаць дадзеную працэдуру. Ці зможа яна перадаць свае «соткі» ў спадчыну сынам?

— Зямельны ўчастак грамадзянкі знаходзіцца на праве пажыццёвага спадчыннага валодання, — растлумачыла нам **загадчыца сектара землеўпарадкавання Жодзінскага гарвыканкама Людміла ЯЗЕВІЧ.** — Такім чынам, Валянціна Іванаўна мае права на пажыццёвае карыстанне зямельным участкам і аб'ектамі нерухомасці на ім — гэта замацаванае заканадаўча адзінства аб'екта нерухомасці і зямельнага ўчастка. Таксама яна можа перадаць усё гэта ў спадчыну сваім дзецям. Пры гэтым любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь



можа звярнуцца ў гарвыканкам для прадастаўлення зямельнага ўчастка ў прыватную ўласнасць. Свае права ён можа рэалізаваць пасля вынясення адпаведнага рашэння і выкупу зямлі па кадастравым кошце.

— У цэлым, розніца для ўласніка нерухомасці ў валоданні зямельным участкам на праве пажыццёва спадчыннага валодання і прыватнай уласнасці не такая вялікая, як можа здацца на першы погляд. У абодвух выпадках уласнік мае права продажу, дарэння і перадачы ў спадчыну аб'екта, размешчанага на зарэгістраваным участку, — адзначае адвакат Алена Гронская.

### Родныя сцены

Пытанне Валянціны Іванаўны аказалася нескладанае. Аднак нярэдка людзі — і часцей пажылыя жанчыны — сутыкаюцца са значна больш няпростымі сітуацыямі. Пасля смерці блізкіх узнікае неабходнасць у афармленні спадчынных правоў, і калі чалавек не паклапаціўся пра любімых загадзя, іх часам могуць чакаць непрыемныя сюрпрызы, адзначае Алена Гронская.

*Святлана Сяргееўна развялася з мужам, калі ёй яшчэ не было трыццаці. Адна выгадавала дваіх дзяцей. Добрага чалавека, якога чакала ўсё жыццё, лёс падарыў ёй толькі ва ўзросце 53-х гадоў. Разам з Алегам Сцяпанавічам пражылі яны без малога трыццаць гадоў. Дом, агарод... Дарослыя дзеці з абодвух бакоў жылі дружна. Улетку дом напаўняўся галасамі ўнукаў і праўнукаў — ні ён, ні яна не дзялілі іх на «сваіх» і «чужых». А шлюб афіцыйнага шлюбу не заключылі — дык немаладыя ўжо, і без гэтага лічылі адно аднаго мужам і жонкай. Але вось Алега Сцяпанавіча не стала, і дзеці захацелі прадаць дом бацькі. А Святлана Сяргееўна павінна пакінуць любімыя сцены. Ці правільна гэта, бо яна даглядала нямоглага пасля інсульту мужчыну паўгода. Яго дзеці з'яўляліся рэдка, а цяпер дзеляць спадчыну, піша яна.*

— Асобы, якія знаходзіліся на дзень смерці са спадчынадаўцам у фактычных шлюбных адносінах, але не былі зарэгістраваныя, не могуць прэтэндаваць на статус спадчынніка першай чаргі, — кажа адвакат Алена Гронская. — У адпаведнасці з заканадаўствам прызнаецца толькі шлюб, заключаны ў органах, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану. Права на спадчыну асоб, якія знаходзіліся ў «грамадзянскім шлюбе», адзін пасля аднаго практычна выключаецца. Аднак з гэтага правіла ёсць выключэнні. Сужыцель можа прэтэндаваць на права атрымання спадчыны ў выпадку смерці іншага сужыцеля, толькі калі спадчынадавец пакінуў завяшчанне на яго карысць альбо калі той, хто застаўся, з'яўляецца непрацаздольным утрыманцам. У заканадаўстве прадугледжана, што непрацаздольныя ўтрыманцы спадчынадаўца маюць права на спадчыну разам са спадчыннікамі той чаргі, якая прыцягнута да атрымання спадчыны. Да ліку спадчыннікаў па законе таксама належаць грамадзяне, якія не ўваходзяць у кола спадчыннікаў першай, другой, трэцяй, чацвёртай і наступных чэргаў, але да моманту адкрыцця спадчыны з'яўляліся непрацаздольнымі, не менш за адзін год знаходзіліся на ўтрыманні спадчынадаўца і пражывалі сумесна з ім. Пры наяўнасці іншых спадчыннікаў па законе яны атрымліваюць спачыну разам са спадчыннікамі той чаргі, якая прыцягваецца да атрымання спачыны, аднак не больш за адну чацвёртую частку спадчыны. Пры адсутнасці ў памерлага іншых спадчыннікаў непрацаздольныя ўтрыманцы спадчынадаўца атрымліваюць спачыну самастойна ў роўных долях. Гэта непрацаздольныя асобы, што знаходзіліся на яго поўным утрыманні або атрымлівалі ад яго такую дапамогу, якая была для іх асноўнай і пастаяннай крыніцай сродкаў на існаванне.



Дарэчы, спадчына — гэта не заўсёды прыбытак.

— У склад спадчыны ўваходзяць не толькі маёмасць, іншыя правы, але і даўгі спадчынадаўца, — папярэджвае адвакат.

Агульны тэрмін для прыняцця спадчыны — шэсць месяцаў з дня яе адкрыцця (з дня смерці грамадзяніна), тлумачыць суразмоўніца. Для афармлення спадчынных правоў спадчыннікам неабходна звярнуцца ў натарыяльную кантору па апошнім месцы жыхарства памерлага.

### Ці пісаць завяшчанне

Вырашыць пытанне Святланы Сяргееўны (акрамя наяўнасці зарэгістраванага ва ўстаноўленым парадку шлюбу) магло б завяшчанне яе грамадзянскага мужа. Але ні ён, ні яна аб гэтым не падумалі.

— Не хацелася думаць пра дрэннае, — кажа чытачка. — Я ўсё спадзявалася, што ён падымецца з ложка і мы пажывём шчасліва яшчэ хоць некалькі гадкоў. Не загаворвала аб завяшчанні — баялася знерваваць.

Пры атрыманні ў спадчыну па завяшчанні прызначэнне спадчыннікаў і парадак размеркавання маёмасці паміж імі залежыць выключна ад волі спадчынадаўца, расказвае адвакат Алена Гронская.

— Завяшчанне павінна быць складзена ў пісьмовай форме, засведчана натарыусам і ўласнаручна падпісана завяшчальнікам. Свабода завяшчальніка ў выказванні сваёй волі выяўляецца ў магчымасці адмяніць раней складзенае завяшчанне ў цэлым або змяніць яго шляхам адмены, змянення або дапаўнення асобных распараджэнняў. Пры складанні завяшчання не патрабуецца згоды асобы, якой завяшчаецца маёмасць. Грамадзянін мае права завяшчаць усю сваю маёмасць або частку яе як асобам, якія ўваходзяць, так і тым, хто не ўваходзіць у кола спадчыннікаў па законе, без тлумачэння прычын. Таксама завяшчальнік мае права



пазбавіць спадчыны спадчыннікаў па законе.

Свабода завяшчання абмяжоўваецца правіламі аб абавязковай долі ў спадчыне. Правы на абавязковую долю ў спадчыне маюць непаўнагадовыя і непрацаздольныя дзеці спадчынадаўца, а таксама яго непрацаздольны муж (жонка) і бацькі, якія атрымліваюць спадчыну незалежна ад зместу завяшчання не менш за палову долі, якая належала б кожнаму з іх пры атрыманні ў спадчыну па законе, адзначае адвакат. Да непрацаздольных належаць асобы, якія маюць права на атрыманне пенсіі па ўзросце, інваліды 1-й, 2-й, 3-й груп, а таксама асобы, якія не дасягнулі 18 гадоў.

— У сітуацыі Святланы Сяргееўны не выключаецца прыцягненне яе да атрымання спадчыны як непрацаздольнага ўтрыманца. Аднак факт сумеснага пражывання з памерлым і вядзенне з ім агульнай гаспадаркі не сведчаць аб тым, што чытачка знаходзілася на поўным утрыманні спадчынадаўца. Неабходна прыводзіць адпаведныя доказы, — гаворыць адвакат.

### А можа, падарыць?

Завяшчанне — слова невясёлае. Значна больш прыемна гучыць слова «падарунак». Але вырашыўшы аформіць дароўны дакумент на сваю маёмасць, пажылому чалавеку варта памятаць аб нюансах заканадаўства.

— Адназначна адказаць на пытанне, што лепш — падарыць або завяшчаць, немагчыма. Перш за ўсё, для прыняцця рашэння неабходна ведаць, якія наступствы мае здзелка для дарыльшчыка і таго, хто дар атрымае. Няведанне юрыдычных тонкасцяў пры выбары: падарунак або завяшчанне часам прыводзіць да непапраўных наступстваў, — падкрэслівае адвакат.

У чым жа адрозненні дагавора дарэння ад завяшчання?

**• Па-першае, завяшчанне, у адрозненне ад дагавора дарэння, падлягае адмене ў любы момант па жаданні асобы, якая яго склала,** тлумачыць суразмоўніца. Прычым вы маеце права неаднаразова мяняць сваё волевыяўленне. А вось дагавор дарэння не падлягае адмене, за рэдкім выключэннем. Аднак правілы аб адмене дарэння не прымяняюцца да звычайных падарункаў невялікага кошту (кошт якіх не перавышае ўстаноўленага заканадаўствам пяціразовага памеру базавай велічыні), падкрэслівае адвакат.

• Па-другое, **варта ведаць, што пры наяўнасці завяшчання пераход права ўласнасці мае месца толькі пасля смерці асобы, якая склала завяшчанне.**

— Такім чынам, пры жыцці ўласнікам маёмасці, нягледзячы на наяўнасць завяшчання, застаецца асоба, што склала завяшчанне. Дагавор дарэння прадугледжвае пераход права ўласнасці пасля афармлення здзелкі належным чынам: атрымальнік падарунка становіцца ўласнікам маёмасці, а дарыльшчык страчвае права ўласнасці.

• Па-трэцяе, **для завяшчання закон прадугледжвае толькі пісьмовую форму, абавязкова натарыяльна засведчаную. Дагавор дарэння ў асобных выпадках можа быць здзейснены вусна. Зрэшты, дагавор дарэння нерухомай маёмасці заключаецца толькі ў пісьмовай форме з абавязковым натарыяльным пасведчаннем і падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі.**

— Не варта меркаваць аб атрыманні ў спадчыну па серыялах або вопыце суседкі, — падкрэслівае спецыяліст. — У спадчынным праве ёсць мноства нюансаў, якія цяжка ўлічыць самастойна. Таму так важна своечасова звярнуцца па атрыманне кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі да адваката і (або) натарыуса. Гэта дазволіць прыняць правільнае рашэнне і пазбегнуць праблем у будучыні.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Пісьменніцкія вандроўкі

# СКУЛЬПТУРЫ Ў НОВЫХ КАШУЛЯХ, альбо Таямніца рыжскай кафлі

## Якія сакрэты хавае ў сабе закінутая сядзіба на Ушаччыне

**«Яшчэ ў 20-я гады то была здатная будыніна з верандай, зашклёнай разнаколернымі шкельцамі», — пісаў Васіль Быкаў пра сядзібу, каля якой часта бавіў час у маленстве... Больш за тое — гэтае месца ў некаторых крыніцах значыцца як ягонае месца нараджэння, нават уласнай рукой так запаўняў анкеты. Як тлумачыў сам, родныя Бычкі знаходзяцца побач, а загс — тут, у сельсавеце ў Чарапоўшчыне. Вось бацькі калісьці і аднеслі туды будучага класіка, каб зарэгістраваць.**
**Мы кіруемся туды, дзе гуляў з сябрамі малы Васіль... А менавіта да сядзібы Маліноўскіх у Чарапоўшчыне, што на азёрнай Ушаччыне.**

### ЖОЎТАЯ КАФЛЯ, ЧОРНЫЯ БЭЛЬКІ

Надвор'е выпала самае гатычнае: дождж, вецер... Ну і антураж адпаведны. Пад'ехаць немагчыма, даводзіцца ісці па размоклай сцежцы, па слізкіх кладках праз лужыны, праз высокую пажоўклую траву і кустоўе, паўз паваленыя дрэвы... З-за таго кустоўя нават не адразу разглядзелі сядзібу: цэгла паныла чырванее ў прагалах лістоты...

чынялі школы для сялян... Але былі свае «шкілеты ў шафе». Як піша Грасільда, яе маці, Канкордзія, была аддадзена ў Полацк, у пансіён пры кляштары. І дужа ж захацела стаць мнішкаю. Але маці вырашыла выдаць яе замуж, і абрала з прэтэндэнтаў Ігнацыя Маліноўскага. Канкордзіі было пятнаццаць, яна благала, прасілася — яе змушалі розгамі. Дзед ейны плакаў разам з ёю — але нічога не мог зрабіць. Маліноўскі, вядома, нічога не ведаў пра гэткі настрой нявесты, бо не меў магчымасці з ёй перагаварыць. Так і выйшла замуж Канкордзія, хоць і марыла пра кляштар... І нарадзіла дванаццаць дзяцей: Аляксандра, Леакадзію, Рудольфа, Грасыльду-Адэлю, Эдварда, Зофію, Антона, Камілу, Уладзіміра, Геруся, Міхаліну і Марыю.



І сядзіба сёння выглядае гатычна... Няма веранды з рознакаляровымі шкельцамі, дый даху няма... І ўвогуле мала што засталося. Некалькі гадоў таму тут здарыўся пажар, а была пабудова часткова драўляная... А паколькі стаіць наводшыбе, дык і пажарных няма каму было клікаць. І цяпер будынак нагадвае недавершаны дзіцячы малюнак: пустыя аконныя прагалы, комін, які цягнецца да хмар праз неіснуючы другі паверх... Унутры будынка растуць дрэвы, валяецца пабітая цэгла, бяссіла ляжаць абгарэлыя бэлькі... Падымаю палову жоўтай кафлі, якой, магчыма, быў абкладзены камін, што яшчэ зеўрыцца чорнай пашчай. На адваротным баку — кляймо, дзе значыцца месца вытворчасці — Рыга... Кляйма толькі частка, хутчэй за ўсё, гэта вядомая фабрыка, якая дзейнічала ў Рызе на мяжы XIX і XX стагоддзяў — «Zelm&Boehm», адзін з яе ўладальнікаў ставіў кляймо «Frdr. Zelm», падобнае да таго, што на кафлі.

Каб зразумець шлях гэтай кафлі на Вушаччыну, трэба паглыбіцца ў гісторыю ўладальнікаў — роду Маліноўскіх. А найлепшая крыніца — успаміны Грасільды Маліноўскай «Дзённік крэсовай настаўніцы 1833 — 1921».

### ШЛЮБ ПАД РОЗГАМІ І ДВАНАЦЦАЦЬ ДЗЯЦЕЙ

У сям'і Маліноўскіх усе імкнуліся да адукацыі, ладзілі хатнія аркестры, тэатральныя прадстаўленні, ад-

Менавіта Ігнацій і Канкордзія Маліноўскія і набылі Чарапоўшчыну ў сваё ўладанне. Маці ж пазбавіла Канкордзію пасагу, што нядзіўна, улічваючы іх канфліктныя адносіны.

Падчас паўстання 1863 года ўся сям'я далучылася да інсургентаў. Уладзімір быў у войску Генрыка Дмахоўскага — легендарнага скульптара і інсургента, які загінуў у 1863-м. Пасля гібелі Генрыка і разгрому яго атраду Уладзімір з'ехаў у эміграцыю. Ягоныя сёстры Зося і Грасільда апынуліся ў турме.

Наколькі Грасільда была незвычайнай, адлюстроўвае эпізод з ейных успамінаў. Калі была ў Вільні, у салоне Ждановічаў, там прысутнічаў паэт Людвік Кандратовіч, ён жа Уладзіслаў Сыракомля. Грасільду змусілі прачытаць свае вершы. А потым, як яна ўспамінае, усе крычалі ёй «брава» і пілі за словамі: «Віват Грасільдзе Маліноўскай, паэтцы з Белай Русі!»

Пасля разгрому паўстання ўся маёмасць роду была канфіскаваная, засталася толькі Чарапоўшчына, куды і вярнулася самотная Грасільда... А Уладзімір знайшоў спосаб здабываць грошы, заснаваўшы фотастудыю ў Рызе. У выданні ўспамінаў Грасільды Маліноўскай ёсць выява паштоўкі, дасланай Уладзімірам у Чарапоўшчыну, жонцы Аляксандры: жартоўны малюнак паказвае Уладзіміра ў ягонай студыі. Засяроджаны інтэлігентны акулярык праяўляе здымкі, у той час як двое ці то асістэнтаў, ці то кліентаў строяць з пана кепікі. Дык вось, Уладзімір, які працай здабыў грошай, каб выкупіць радавую сядзібу, для ўзвядзення новага будынка ў Чарапоўшчыне якраз і набываў у Рызе плітку... У тым ліку тую кафлю, што я трымаю ў руках.

Дарэчы, Васіль Быкаў ва ўспамінах «Доўная дарога дадому» згадвае свайго дзеда, Яна Мацея Быка: *«Другі дзед быў селянін-адыходнік, сезонна рабіў на прамысловых прадпрыемствах у Курляндыі, там жа пад канец жыцця выбіўся ва ўпраўляючыя цагельнага завода».*

### ЛЕТУЦЕННАЯ І МОЦНАЯ ГРАСІЛЬДА

Праходзім далей... У колішнім пакоі растуць тонкія дрэўцы. Калісьці тут знаходзілася прыгожая драўляная вінтавая лесвіца на другі паверх. Як кажуць сведкі, захаваліся і ляпныя разеткі, і кесонная столь... Цяпер хіба на фасадзе рэшткі дэкору — пафарбаваныя ў сіні колер аздобы вокнаў. Тут доўгі час месцілася школа. Што цалкам адпавядала памкненням былых гаспадароў. Маліноўскія ўвесь час ладзілі тут школкі... Асабліва шчыравала ў якасці настаўніцы Грасільда. Яна апісвае, як вярнулася з вязніцы сюды, у Чарапоўшчыну, не маючы сродкаў да існавання. Многія баяліся дапамагаць — усё ж пад наглядам паліцыі замужняя сястра крадма ад мужа перадавала прыпасы... *«Так заўжды на свеце, калі фартуна кажа свеціць, прызнаюць яго і свет, і людзі, бачучы ў ім само дабро, гарнуцца да яго, а варта яму спаткаць няшчасце ці які фаталізм, застаецца самотны ў свеце»*, — занатоўвае Грасільда.

Цікавы эпізод — як на дарозе з касцёла галодная Грасільда сустрэла знаёмага яўрэя Абрама, а той, распытаўшы пра справы, даў паненцы халы — святочнага хлеба, што меў з сабою, і далікатна сышоў, каб не бачыць, як яна тут жа ўпілася ў пачастунак зубамі... *«Дужа цяжка цярпець го-*



*лад, асабліва калі ты поўны жыцця і здароўя»*. А вось родны брат Аляксандр, як прыехаў гасцяваць з сям'ёй са Смаленска, сясцёр Грасільду і Зоф'ю, што знаходзіліся пад наглядам паліцыі і не мелі пашпартоў, бэсціў, нават у касцёл не пускаў, не дазваляў есці тыя прысмакі, якія купляў для сябе і сваіх сямейных.

Грасільда, атрымаўшы пашпарт, знайшла сабе месца выкладчыцы ў Мітаве, потым яшчэ дзесьці... Замуж так ніколі і не выйшла.

Пасля амністыі ў Чарапоўшчыне, выкупленай Уладзімірам, сабралася ўся шматлікая сям'я. Калі Уладзімір Маліноўскі ажаніўся з Аляксандрай з Карпушкоў, у іх нарадзілася сямёра дзяцей, чые імёны адлюстроўваюць зацікаўленні пана Маліноўскага: Кейстут, Венцаслаў, Альгерд, Гедымін, Ядвіга, Вітольд і Альдона.

Між тым, мы знаходзім уваход у сутарэнні, маю любімую частку падарожжаў... Захаваліся яны тут добра, цагляныя пазеленелыя скляпенні трымаюцца... Раптам у падлозе — круглая чорная пашча студні...

Не ведаю, адкуль узнікла мяс-



цовая легенда, што ўладальнік сядзібы пан Маліноўскі тапіў у студні свайго маёнтка палюбоўніц, і цяпер тут можна сустрэць іх прывіды. Нават аматары паранармальных з'яў прыкладаюць сюды маршруты. Не ведаю, пра якога канкрэтна з Маліноўскіх гаворка, але што хапала сярод іх дзівакоў, чые паводзіны маглі збянтэжыць староннix назіральнікаў, праўда.

### СКУЛЬПТАР І КАШУЛІ, РЭКТАР І ВАЎКІ

Гасцяваў тут, папраўляючы здароўе, пляменнік Уладзіміра Маліноўскага, вядомы малады скульптар Антон Вівульскі, аўтар помніка Грунвальдскай бітве і віленскіх Трох крыжоў... Па ўспамінах Ядвігі Маліноўскай, звалі яго ў сядзібе ласкава «Антолек». Апантаны юнак праводзіў усе дні ў майстэрні, якую яму дапамаглі зладзіць у Чарапоўшчыне. І вось шматлікія цётачкі заўважылі, што хлопец усё выходзіць да стала ў старых падраных кашулях. Параіліся, скінуліся, паслалі цішком прыслугу на станцыю ў Кублічы купіць скульптару шэсць добрых кашуль... Падклалі яму ў камод. Зноў выходзіць у старой! А новых кашуль на месцы няма... Тады цішком зазірнулі ў яго майстэрню... А злепленыя ім з гліны скульптуры фарсяць у тых новых кашулях! Гліну ж, каб не перасохла, не патрэскалася, належыць абкрываць...

*«Цёткі паківалі галовамі, і тая, што карысталася найбольшым аўтарытэтам, то-бок цётка Грасільда, абвясціла прысуд: « Ну што зробіш — ён жа мастак»*.

Дарэчы, Антолек сябраваў з сынам Адама Міцкевіча і захапляўся творчасцю Гаўдзі.

І вось што цікава: можа, нездарма выбраў Васіль Быкаў, паступаючы ў Віцебскую мастацкую вучэльню, аддзяленне скульптуры? Мусілі ў яго дзяцінстве хадзіць расповеды пра дзівакаватага госця Чарапоўшчыны і яго занятак...

Бываў тут і яшчэ адзін дужа інтэлектуальны госць... Сястра жонкі Уладзіміра Маліноўскага выйшла за будучага рэктара віленскага ўніверсітэта, астранома Уладзіслава Дзявульскага. Вось якія цікавыя ўспаміны яго нашчадка Вацлава Дзявульскага знайшла ў сеціве: *«Позняй восенню 1906 году Уладзіслаў выбраўся да Чарапоўшчыны, каб праціць у бацькоў рукі Ядзвігі. Выслалі коней на чыгуначную станцыю ў Полацак (за 50 вёрстаў), але ранняя і снежная зіма спаралізавала камунікацыі. Калі Дзявульскі выйшаў у Полацку, коней не было. Выехаў на вясковых санях і... удвох з возчыкам раскопвалі ўначы напатканыя сумёты, а выццё ваўкоў дадавала ім моцы. Калі стаў на ганку дома ў Чарапоўшчыне, Маліноўскія перапужаліся, бо Уладзіслаў выбраўся на поўнач у кракаўскім палітоне»*.

Дарэчы, менавіта тут, у Чарапоўшчыне, і адбыўся шлюб Уладзіслава і Ядвігі... Што цьмяна ўяўляецца, калі аглядаеш руіны.

Знаходжу дзверы, наглуха забітыя. Туды вядуць паўкруглыя прыступкі, спрэс засыпаныя жоўта-брунатным лісцем. Лесвіца ў мінулае... Быў час, калі гэтая сядзіба належала калгасу «Бязбожнік». Пасля вайны тут ажно да 1980-х працавала школа. Пасля думалі зладзіць прафілакторый... Сёння — маляўнічае папялішча.

Мы пакідаем сядзібу ў Чарапоўшчыне, якая глядзіць нам услед чорнымі прагаламі вокнаў, высокі комін уздымаецца ў неба, як мачта карабля, які пацярпеў крушэнне... Застаецца спадзявацца, што той карабель не знікне зусім, не ператорыцца ў друз.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

# КОЛА МЛЫНА, ПЛЫНЬ ГІСТОРЫІ

## Выйшла ўнікальнае выданне пра беларускія вадзяныя млыны

**Калі ў чалавеку спалучаюцца якасці прадпрымальніка, мецэната і цікаўнага даследчыка, то вынік можа быць вельмі плённы. Добры таму прыклад — асоба Францішка ЖЫЛКІ. Нядаўна ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі была прэзентавана яго кніга «Млынарства Беларусі: гісторыя і сучаснасць». Але гэтае выданне — своеасаблівы працяг добрых спраў, якія робіць яе аўтар для нашай краіны і для сваёй малой радзімы ўжо не першы год.**

— Вельмі прыемна ад таго, што ў Беларусі ёсць людзі, якія могуць дасягнуць поспеху ў асабістай справе, зрабіць свой бізнес, але пры гэтым вельмі трапятліва ставіцца да малой радзімы. Стварыць музей побыту, аднавіць млын, пабудаваць капліцу для тых, хто ўжо з прычыны ўзросту не можа трапіць у касцёл... Насамрэч гэта ўсё дарагога варта, — адзначыла падчас прэзентацыі **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана КНІЖНІКАВА**.

Новае прэзентаванае выданне — гэта ўнікальная магчымасць зацікаўленым чытачам паглыбіцца ў гісторыю роднага краю, у гісторыю млынарства. У кнізе сабраны сотні фотаздымкаў тых мясцін, дзе працавалі некалі і захаваліся да сёння вадзяныя млыны. Тут адлюстравана багацце разнастайнай архітэктуры вадзяных млыноў, прыведзены творы мастакоў, змешчаны звесткі пра млыны з архіваў.

— Вадзяныя млыны — гэта вельмі важная гісторыка-культурная спадчына Беларусі. Амаль забытая, занядбаная, якая патрабуе сёння пільнай увагі. Таму што, як вядома, млыны (а вадзяныя млыны складалі большасць) на Беларусі з'яўляліся вельмі важнымі не толькі прамысловымі, але і сацыяльна-культурнымі аб'ектамі, дзе людзі збіраліся не толькі зрабіць канкрэтную справу, але і падзяліцца навінамі, абмеркаваць нешта... Я ўспамінаю, калі мае бацькі ехалі на млын, тата збіраўся нібы на свята. Ён рыхтаваўся, бо вёз туды самае дарагое — збожжа, якое ён сам вырасціў, каб дамоў прывезці муку, што стане потым асновай для хлеба, — распавядае **старшыня Беларускага фонду культуры Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ**. — Да таго ж уладальнікі млыноў заўсёды былі не толькі заможнымі, але і вельмі адукаванымі людзьмі. Яны карысталіся заслужанай павагай сярод аднавяскоўцаў, сярод жыхароў мястэчак, гарадоў. Таму гэтая гісторыка-культурная спадчына патрабуе сёння пільнай увагі. Ёсць яшчэ магчымасць многія млыны аднавіць іператварыць іх у цікавыя аб'екты для мясцовых жыхароў, для турыстаў. Спадзяюся, што кніга будзе вельмі добрым штуршком і для мясцовых улад, і для краязнаўцаў па аднаўленні і вывучэнні мясцовых млыноў, па стварэнні там турыстычных маршрутаў і новых цікавых аб'ектаў.




Менавіта так аўтар прэзентаванага выдання і зрабіў тады, калі даў «новае жыццё» вадзяному млыну, які некалі належаў яго сям'і. Дзякуючы неабыякавасці і жаданню пакінуць важныя сведчанні мінулага на роднай зямлі Францішак Жылка стварыў Музей вадзянога млына XVIII стагоддзя ў аграгарадку Жодзішкі ў Смаргонскім раёне. Мясціны там маляўнічыя, і гісторыя ў іх цікавая. Жодзішкі размешчаны на беразе ракі Віліі і вядомыя з пачатку XVI стагоддзя. Вадзяны млын тут пабудавалі ў 1781 годзе. І сёння кожны наведвальнік ці то з Беларусі, ці то з замежжа можа не толькі ўбачыць яго ў дзеянні, але і здабыць непаўторны вопыт працы на ім. Пры жаданні любы чалавек здольны тут сваімі рукамі змалоць збожжа на муку, з якой потым выпякаецца хлеб... Такое адчуванне нікога, мяркую, не пакіне без эмоцый і новых ведаў. Як і кніга аўтара пра млынарства на беларускіх землях. Сам аўтар на прэзентацыі кнігі, дарэчы, таксама згадваў той час, калі прыходзіў на млын шасці-сямігадовым хлопчыкам і заставаўся пад вялікім уражаннем ад таго, як усё там працавала...

Вадзяны млын у Жодзішках аднаўлены дбаннем нашчадка яго гаспадароў.



— Для мяне было важна зафіксаваць, у якім стане знаходзяцца будынкі млыноў на пачатку XXI стагоддзя. Кніжка беларускамоўная, і пры чытанні вы заўважыце, што ў ёй шмат тэхнічнай лексікі, але па-беларуску мне было нават прасцей падабраць патрэбнае слова, — дзеліцца **аўтар выдання «Млынарства Беларусі: гісторыя і сучаснасць» Францішак ЖЫЛКА**. — У гэтай кнізе адлюстравана больш за 150 млыноў. І гэта неабавязкова будынкі, могуць быць і падворкі. Сёння існуюць розныя варыянты, дзе такія млыны былі. Ёсць млыны, дзе сёння жывуць людзі. Там пад падлогай цячэ вада, але ўмовы для жыцця нармальныя, і вільгаці таксама не адчуваецца. Але ёсць млыны, дзе будынак у добрым стане, і ніхто не можа вырашыць, пад што яго прыстасаваць. А можна было б іх для розных мэт выкарыстаць: для жылля, экспазіцыі цікавыя ладзіць...

Аўтар згадаў і складанасці, што былі падчас яго вандровак-даследаванняў. Прыязджаеш млын шукаць, а няма ў каго пра яго запытаць, бо ўсе хаты пад замкамі. Лёс гаспадароў млыноў для аўтара кнігі — вельмі прыцягальная тэма. Ён успамінае, што заўсёды памятаў дзядулеў млын, а пасля аднойчы адважыўся паабяцаць сваім дзядзькам, што ўратуе яго ад знікнення. І слова сваё стрымаў. А новая кніга — як яшчэ адна цаглінка ў імкненні захаваць гістарычную і культурную спадчыну роднага краю.

— Францішак Жылка падняў у гэтай кнізе цэлы гістарычны пласт, паказаў тую самую эканамічную жылку, якая была ў жыхарах Беларусі ва ўсе часы, прадэманстраваў дух і ролю гаспадарчага збудавання, паказаў гідралагічную ролю самых цікавых аб'ектаў, якія ёсць, — плацін, рэк, азёр, сажалак. Аўтар ацаніў тую гаспадарчую дзейнасць, якая на працягу некалькіх соцень гадоў вызначала напрамак развіцця нашай краіны, — зазначае **старшыня Беларускага геаграфічнага таварыства Аляксей ЯРОТАЎ**.

Дарэчы, экзэмпляр кнігі падчас прэзентацыі ўрачыста перадалі і ў фонд Нацыянальнай бібліятэкі.

**Алена ДРАПКО.**

# ДЛЯ ЎСЁЙ СЯМ'І

## Дзень маці разам з Нацыянальным мастацкім музеем

**Напэўна, самы прыгожы і ўлюбёны вобраз сусветнага мастацтва — гэта вобраз той, якая дорыць жыццё, вобраз матулі... Гэта пацвярджаюць і калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, якія зараз рыхтуецца да святкавання Дня маці.**

Праграма мерапрыемстваў вялікая і разнастайная, менавіта таму яна будзе доўжыцца з 13 да 17 кастрычніка. На працягу тыдня наведвальнікаў чакаюць розныя актыўнасці: як сацыяльна значныя, так і забаўляльныя. «Звязда» распавядае, на што варта звярнуць увагу.

**13 кастрычніка** адбудзецца інтэрактыўнае мерапрыемства для дзяцей 5—7 гадоў. Навукова-пазнавальная «Арт-лабараторыя» праводзіцца на пастаяннай аснове для малых розных узростаў, а святкаванне Дня маці стане добрай нагодай, каб бліжэй пазнаёміцца з праектам.

**14 кастрычніка** запланавана правядзенне адразу некалькіх акцый, ладзіць якія будзе мастачка Эвеліна Крыштаповіч. У дзіцячым інтэрактыўным пакоі мастачка, працуючы ў стылі манументалізму, распіша сцяну. Таксама яна правядзе майстар-клас па маляванні для дзяцей і бацькоў. Для маленькіх удзельнікаў, якім не хопіць уражанняў ад папярэдніх акцый, арганізуюць інтэрактыўную музейную праграму «Пагуляем у нацюрморт». Дарослых жа чакае тэматычная экскурсія «Вобраз Багародзіцы ў беларускім іканапісе».

**15 кастрычніка** таксама адбудзецца спецыяльная экскурсія «Жаночы партрэт у мастацтве».

**16 кастрычніка** пройдзе некалькі мерапрыемстваў. Першае — сустрэча са старшынёй Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» Веранікай Сярдзюк, падчас якой можна будзе задаць пытанні. Наступная акцыя будзе больш мастацкай: наведвальнікаў чакае канцэрт узорнага дзіцячага хору «Музыкі, якія спяваюць».



Фота БелТА.

**17 кастрычніка** святочны тыдзень завершыцца тэатралізаванай прэзентацыяй кнігі Кацярыны Залескай «Чароўныя сны Зузачкі», а таксама майстар-класам Веранікі Фурсавай па стварэнні паштоўкі, якую можна падарыць матулі.

Адзначым, што на шэраг мерапрыемстваў неабходны папярэдні запіс. Гэта датычыцца ўсіх акцый, акрамя тых, што адбудуцца 16 кастрычніка.

Нацыянальны мастацкі музей чакае ўсіх ахвотных незвычайна адзначыць Дзень маці, і, вядома, будзе сімвалічна, калі для кагосьці наведванне музея стане сямейным святам.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Пласты гісторыі

# ФАРТЫФІКАЦЫЯ СТАРАЖЫТНАСЦІ

## Выяўлена яшчэ адна крэпасць Вялікай Кітайскай сцяны

**Новыя архітэктурныя каштоўнасці былі знойдзены на руінах замка Цынпінбаа ў правінцыі Шэньсі на паўночным захадзе Кітая. Гэта руіны сярэднявечнага замка, які ўваходзіў у сістэму фартыфікацый Вялікай Кітайскай сцяны.**

Пра гэта паведаміла кітайскае агенцтва «Сіньхуа», спасылаючыся на Акадэмію археалогіі Шаньсі. Знаходка адносіцца да перыяду Дынастыі Мінь (1368—1644 гады).

Гаворка ідзе пра два брукаваныя двары крэпасці. Сцены, будынкі і каменны мур добра захаваліся да нашага часу.



Археолагі знайшлі на пляцоўцы і каменную таблічку з запісамі. З іх вынікае, што там раней размяшчаўся храм пад назвай Палац Сянын. Таксама было знойдзена больш за 30 размаляваных гліняных статуй. Яшчэ адна брукаваная пляцоўка — рэшткі падмурка больш буйнога будынка.

Вялікая Кітайская сцяна даўжынёй 8851 кіламетр і 800 метраў лічылася ўвасабленнем тыранаў, а мясцовыя жыхары мелі магчымасць разбіраць яе па цаглінцы для ўласных патрэб. Таму цяпер вялікая частка гэтай архітэктурнай славутасці проста недаступная для турыстаў з-за свайго аварыйнага стану, прычынай якога таксама былі і прыродныя стыхіі.

Часткі, якія мы звычайна асацыюем з Вялікай Кітайскай сцяной, былі пабудаваныя дынастыяй Мін. Гэта апошняя частка сцяны, яна зроблена з цэглы і ўмацавана многімі вартавымі вежамі.

Да пандэміі Вялікую Кітайскую сцяну штогод наведвала больш за дзесяць мільёнаў турыстаў у год.

Каго мы бачым!

# СПІС ПАПОЎНІЎСЯ

## Навукоўцы знайшлі пяць новых відаў павукоў



**Пра гэта гаворыцца ў публікацыі Арганізацыі навуковых і прамысловых даследаванняў Аўстраліі (CSIRO).**

«Цяпер мы можам афіцыйна дадаць пяць новых відаў у доўгі спіс аўстралійскіх павукоў-лазутчыкаў — сваякоў тарантулаў», — распавялі навукоўцы.

Так, павукі-самкі, знойдзеныя ў Брысбене, хрыбце Д'Агілар і ў розных іншых абласцях, аказаліся некалькі зусім рознымі відамі, новымі для навукі. Гэтыя віды нязначна адрозніваюцца памерам і колерам.

Такім чынам, навукоўцы выявілі Euoplos raveni і Euoplos schmidti з нізінных лясоў даліны Брысбен, Euoplos regalis з высакагорных трапічных лясоў хрыбта Д'Агілар, Euoplos jayneae з нізінных лясоў раёнаў Саншайн-Кост і Euoplos booloumba з высакагорных трапічных лясоў хрыбта Канандалес.

Гэтыя членістаногія хаваюцца ў норках і зачыняюцца «накрыўкамі» з павуціння і гліны. Па словах навукоўцаў, павукі насяляюць толькі асобныя невялікія тэрыторыі, таму адкрыццё новых відаў дапамагае захаваць іх папуляцыю.

На дадзены момант навуцы вядомыя больш за 4000 відаў павукоў Аўстраліі, аднак даследчыкі лічаць, што, хутчэй за ўсё, большасць існуючых членістаногіх мацерыка яшчэ невядомыя навуцы.

Тэхналогіі будучыні

# ПАРАТУНАК СА ДНА

## Лекавае злучэнне — у водарасцях мора

**Вучоныя навукова-даследчага цэнтра «Курчатаўскі інстытут» правялі даследаванне антыбактэрыяльных уласцівасцяў фукаідану — прыроднага злучэння, вылучанага з бурых водарасцяў Баранцавага мора. Эксперыменты на мікраарганізмах паказалі, што злучэнне падаўляе рост хваробатворных бактэрый больш чым на 90 працэнтаў. Акрамя таго, як мяркуюць навукоўцы, рэчыва можна выкарыстоўваць сумесна з класічнымі антыбіётыкамі, нівеліруючы іх пабочныя эфекты.**

Для свайго эксперымента супрацоўнікі Курчатаўскага інстытута разам з калегамі з Мурманскага марскога біялагічнага інстытута сабралі ўзоры водарасцяў з участку дна, які агаляецца падчас адліву, недалёка ад вёскі Церыберка Мурманскай вобласці. Утрыманне ў расліне фукаідану склала 10 працэнтаў. Злучэнне вылучылі з марской флоры пры дапамозе апрацоўкі растворам этылавага спірту і ўздзеяння ўльтрагукам.

Дзеянне атрыманага рэчыва выпрабавалі на 12 бактэрыяльных штамах. Было паказана, што ўсяго 4—6 мг/мл гэтага рэчыва дастаткова для спынення росту бактэрый. Навукоўцы ўстанавілі, што эфект фукаідану паддаецца кантролю з дапамогай правільна падабранай дазіроўкі.

Аўтары даследавання адзначаюць патэнцыял фукаідану для шырокага спектра медыцынскага прымянення. Ён можа аказацца перспектыўным не толькі для стварэння новых антыбактэрыяльных прэпаратаў, але і для лячэння анкалогіі і іншых захворванняў. Злучэнне добра паказала сябе ў якасці сродку, які стрымлівае рост ракавых пухлін у жывёл. Акрамя таго, раней тая ж група навукоўцаў Курчатаўскага інстытута сумесна з супрацоўнікамі НДІ хуткай дапамогі імя Джанелідзэ правяла выпрабаванні, у якіх фукаідан выкарыстоўваўся для лячэння апёкаў у пацукоў. Пры нанясенні на раны прэпаратаў, прыгатаваных з бактэрыяльнай цэлюлозы, якую дадаткова насычалі растворам фукаідану, апёкі загойваліся значна хутчэй, чым без выкарыстання гэтага злучэння.



Здароўе на талерцы

# КАРЫСНАЯ АМЕГА-3

## Peралічаны здольныя падоўжыць жыццё прадукты



**Высокі ўзровень тлустых кіслот амега-3 у арганізме дабратворна ўплывае на яго агульны стан, а таксама павялічвае працягласць жыцця. Да такой высновы прыйшлі амерыканскія навукоўцы, праца якіх апублікавана ў часопісе American Journal of Clinical Nutrition.**

Паводле вынікаў даследавання, амега-3 аказваюць станоўчае ўздзеянне на работу сардэчнай сістэмы, а таксама спрыяюць зніжэнню запаленняў. Пры гэтым было ўстаноўлена, што людзі, у якіх у крыві выяўлена павышанае ўтрыманне амега-3, жывуць на пяць гадоў даўжэй.

Навукоўцы падкрэсліваюць, што ўзровень дадзеных рэчываў у арганізме з'яўляецца не менш істотным фактарам, які ўплывае на даўгалецце, чым курэнне.

Спецыялісты рэкамендуюць узбагаціць рацыён прадуктамі, якія змяшчаюць амега-3. Да іх адносіцца ласось, насенне лёну, палтус, тунец, макрэль, насенне чыа.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Лот 1: автомобиль GAZ-31105 (седан), 2005 г. в., регистрационный № 0492 АМ-4, VIN № 963110505127166 7, пробег 539 505 км**

Начальная цена продажи – 2 280 руб. (две тысячи двести восемьдесят рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 228 руб. (двести двадцать восемь рублей)

Продавец – Гроднооблпотребобщество (Мостовский филиал), 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-70

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012050083 3225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 12 ноября 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 10 ноября 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Витко-Агро» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

**ПРИЦЕПНОЙ СВЕКЛОУБОРОЧНЫЙ КОМБАЙН-ПЕРЕГРУЗЧИК «Grimme» Rootster 604,**

**заводской № 77000092, инвентарный № 1883, 2012 год выпуска, производитель – Германия и ботвоудалитель «Grimme» ВМ 300, заводской № 84000057, инвентарный № 1884, 2012 год выпуска, производитель – Англия.**

**Имущество расположено по адресу: Минская область, Слуцкий район, аг. Октябрь, территория МТП.**
Начальная цена с НДС (20 %) **– 94 850,00** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 61,2 %.*
Задаток 10 % от начальной цены – **9 485,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016933 0000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 13.01.2021, 13.03.2021, 27.05.2021.

Аукцион состоится **02.11.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.11.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (033) 668-83-17.**

УНН 600043245



| | |
|---|---|
| Полное наименование | **Общество с ограниченной ответственностью «Темпл Сити»** |
| Местонахождение | 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7 |
| Дата принятия решения о совершении сделки | 30.09.2021 |
| Вид сделки (каждой из взаимосвязанных сделок): | Договор купли-продажи (первичного размещения) облигаций четвертого выпуска ООО «Темпл Сити» |
| Стороны сделки | ООО «Темпл Сити» (Продавец) ОАО «БНБ-Банк» (Покупатель) |
| Предмет сделки | Эмиссионные ценные бумаги – облигации, зарегистрированные за номером 5-200-02-4344 |
| Сумма сделки | 500 000,00 евро (пятьсот тысяч евро 00 евроцентов) |
| Балансовая стоимость активов ООО «Темпл Сити», определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период, предшествующий дню принятия решения о совершении сделки (тыс. руб.) | 7 343 |

УНП 192280260



ОБЪЯВЛЕНИЕ

УНП 600013173

**ОАО «Минскоблхлебопродукт»**
**извещает, что 27 октября 2021 г. состоится внеочередное общее собрание акционеров по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2.**
**Начало собрания в 11.00. Регистрация акционеров с 10.30.**
**При себе иметь: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О реорганизации открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт» путем присоединения к нему унитарного предприятия «Борисовский комбинат хлебопродуктов»;
2. Об утверждении договора присоединения УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» к ОАО «Минскоблхлебопродукт»;
3. О даче поручения и.о. генерального директора Савченко А.А.: в установленном законодательством и уставом порядке уведомить кредиторов предприятия о реорганизации ОАО «Минскоблхлебопродукт».

## Алім СЕЛІМАЎ:

# «БЕЛАРУСЫ НЯЗРУЧНЫЯ ДЛЯ САПЕРНІКАЎ. А ЧАМУ МЫ НЕ ПАВІННЫ ТАКІЯ БЫЦЬ?»

**«Выступаць самому значна лягчэй, чым глядзець выступленні іншых», — сцвярджае Алім Селімаў, двухразовы чэмпіён свету па грэка-рымскай барацьбе. У маі 2021 года ён узначаліў Беларускую федэрацыю барацьбы, таму мае рацыю. Адна справа — несці адказнасць за сваё выступленне, і зусім іншая — за ўсіх беларускіх барцоў. Пакуль яны не падводзяць: толькі за два апошнія месяцы беларусы заваявалі тры медалі на Алімпійскіх гульнях, два — на юніёрскім чэмпіянаце свету, дзесяць — на Гульнях СНД. Ад гэтага адказнасць для кіраўніцтва толькі расце. Пра свае планы, мэты і задачы ў якасці лідара беларускай барацьбы Алім Селімаў расказаў «Звяздзе».**



***— Алім Максімавіч, за час вашага знаходжання на пасадзе старшыні федэрацыі адбылося мноства падзей. Самая важная — Алімпійскія гульні, дзе барцоўская каманда стала самай паспяховай. Не лічыце, што гэта добры задзел на будучыню?***

— Я спадзяваўся, што ў Токіа ў нас будзе 2-3 медалі. Але заўсёды хочацца больш. Я прагны да вынікаў, усім падабаецца быць на вяршыні. На Алімпіядзе ў Рыа ў нас было тры медалі, вельмі не хацелася зніжаць планку. І атрымалася нават лепш, сёлета было два «серабра», а ў Рыа было дзве «бронзы». І калі ісці па нарастаючай, у Парыжы хочацца быць на вяршыне п'едэстала. Усё, што залежыць ад федэрацыі, мы зробім, будзем дапамагаць спартсменам, і хацелася б бачыць аддачу і ад іх. У нашым РЦАП у Стайках зроблены такія ўмовы, пра якія я ў свой час нават марыць не мог, хоць і не магу сказаць, што мне чагосьці не хапала. І гэтыя ўмовы будуць толькі паляпшацца. Ужо пачалася падрыхтоўка да Алімпійскіх гульняў у Парыжы, дзе мы пастараемся не проста паўтарыць поспех, а і пераўзысці яго.

**«Барацьба — гэта не проста спалучэнне рук, гэта цэлы механізм. І спартсмен павінен быць цэльным механізмам у спорце, у быце, у адносінах да сябе і грамадства. Калі ўсё гэта ёсць у адной асобе — ёсць вынік».**

***— На падрыхтоўку паўплывае тое, што гэты алімпійскі цыкл працягваецца тры гады замест чатырох?***

— Не сказаў бы. Так, трэнерам будзе цяжэй пераглядзець планы падрыхтоўкі, расставіць прыярытэты, правільна спланаваць нагрузачны рэжым. У нас кожны год праводзіцца чэмпіянат свету. Па сутнасці, чым адрозніваюцца гэтыя турніры? Алімпійскія гульні — больш рэзанансная падзея, там збіраюцца ўсе віды спорту, большая ўвага прэсы. Гульні маюць статус галоўнага старту. Пра спартсменаў пастаянна гавораць, ад іх чакаюць медалёў, жадаюць поспеху, праводзяць, нібыта на вайну. Спартсмены адчуваюць вялікую адказнасць і нават ціск. А насамрэч мы так рыхтуемся кожны год да чэмпіянату свету. І падрыхтоўка ніяк не адрозніваецца ад падрыхтоўкі да Алімпіяды.

***— Назіраючы за Алімпійскімі гульнямі, іншымі міжнароднымі спаборніцтвамі, вы заўважылі, наколькі змянілася барацьба ў параўнанні з тым часам, калі вы самі выступалі?***

— Прагрэс ідзе ўперад, усё мяняецца, у тым ліку і барацьба. Мяняюцца правілы, вагавыя катэгорыі, адносіны суддзяў да спартсменаў, сама карцінка барацьбы. Некалькі гадоў таму грэка-рымская барацьба была на мяжы выключэння з алімпійскай сям'і. Старэйшы від спорту! Тады ўвесь барцоўскі свет падняўся на дыбкі. А прычына — недастатковая відовішчнасць, невялікі інтарэс гледачоў. Насамрэч гэта не так. Можна ўключыць любое відэа са спаборніцтваў і паглядзець, колькі людзей на трыбунах.

Спачатку вырашылі правесці рэбрэндынг Міжнароднай федэрацыі і перайменаваць арганізацыю ў Аб'яднаны свет барацьбы (United Wrestling World), поўнасцю змянілі эмблему. Правялі каласальную работу для стварэння яркай карцінкі. Час змяняецца, гледачу трэба шоу. І сёння ёсць патрабаванне UWW, пацверджанае рэгламентам, як ствараць карцінку на міжнародных спаборніцтвах. Мы так працавалі на турніры на прызы Аляксандра Мядзведзя ў верасні. Наша трансляцыя сабрала каля 90 тысяч праглядаў з 46 краін. Маім пажаданнем было здымаць эмоцыі трэнераў і спартсменаў. Мы імкнёмся паказаць нашаму гледачу яркае відовішча.

***— З гэтай прычыны адным з пунктаў вашай перадвыбарнай праграмы была задача «рабіць шоу»?***

— Так, але кожнае шоу патрабуе вялікіх грошай, таму мы пачалі з карцінкі. На турніры на прызы Аляксандра Мядзведзя мы атрымалі вусную падзяку ад дэлегата UWW. І гэта радуе. Калі мы будзем паказваць свой прафесіяналізм, магчыма, у будучым нам давераць правесці добры еўрапейскі старт. І гэта будзе вялікі крок для папулярызацыі барацьбы ў краіне, для прыцягнення ўвагі да нас. Я разумею, што гэта цяжка і затратна, але калі нам дадуць такое права, мы знойдзем на гэта і сродкі, і магчымасці.

***— Карцінка і шоу — гэта вельмі добра. А новыя асаблівасці правядзення схватак з'явіліся?***

— Тут усё залежыць ад саміх спартсменаў. Ёсць вельмі яркія барцы, у якіх запамінальныя, прыгожыя манеры вядзення схватак. На такіх байцоў прыемна глядзець. Часта на спаборніцтвах, у тым ліку і на нашых, здараюцца цікавыя паядынкі, дзе сустракаюцца роўныя саперніцы. І, магчыма, у такіх сустрэчах не будзе яркіх тэхнічных момантаў, але напружанне відаць простым вокам. Відаць, як у іх нацягнутыя нервы, наколькі яны сабраныя. На нашым турніры на прызы Мядзведзя праз такое напружанне нават ледзьве да бойкі не дайшло. Гарачыя дагестанскія хлопцы счапіліся з гарачымі грузінамі. Усё скончылася мірна, але цікавасць гледачоў выклікала, закуліссе ж таксама цікавае.

**«Барацьба — не самы фінансава затратны від спорту, але медалеёмісты. Мы пастаянна даказваем, што апраўдваем усе ўскладзеныя на нас чаканні».**

***— Аляксандр Васілевіч Мядзведзь прызнаўся, што часам сумуе па выступленнях. А ў вас моманты настальгіі бываюць?***

— Часам так, прачынаецца жаданне выйсці на дыван. Але з гадамі гэтае пачуццё патухае. Сёння мне больш хочацца працаваць для спартсменаў, ствараць ім належныя ўмовы. Цяпер у мяне крыху іншае прызначэнне. Я вельмі люблю Беларусь, гэтая краіна мне многае дала. І мне хочацца зрабіць для яе нешта карыснае. Жыццё ж можна і проста пражыць, а можна пакінуць пасля сябе след. Я разумею, што праца менеджараў, кіраўнікоў «няўдзячная». Але што можа быць лепш, калі ты ствараеш умовы для таго, каб дзеці займаліся спортам, дасягалі сваіх мэт? У мяне сёння ёсць задача — стварыць у барацьбе масавасць, прыцягнуць як мага больш дзяцей.

***— І як вы плануеце гэтую задачу вырашаць?***

— У нас ёсць праблема з напаўняльнасцю і абсталяваннем школ. Вельмі часта ў залах, дзе павінны працаваць нашы бясплатныя секцыі, працуюць прыватныя платныя па розных відах спорту. З аднаго боку, гэта правільна. У такіх секцыі робіцца ўсё, каб дзецям было цікава, бяспечна, інакш бацькі не будуць плаціць. Але, на жаль, у барацьбе такога няма. У нас недахоп маладых трэнераў, а старэйшым часта проста нічога не трэба. Вынік у спорце вышэйшых дасягненняў непасрэдна залежыць ад работы з дзіцячым спортам. У нас ёсць пэўныя планы і ідэі, і, дай бог, каб былі магчымасці іх рэалізаваць.

***— Вы кажаце, што не хапае маладых трэнераў, але ў БДУФК працуе кафедра адзінаборстваў, вопытам могуць дзяліцца і непасрэдна спартсмены...***

— Гэта ўсё так. Але праблема недахопу маладых трэнераў застаецца актуальнай. І задача федэрацыі — вырашыць дадзеную праблему. Для гэтага трэба правесці вялікую работу. Калі мы хочам падняць барацьбу ў краіне, трэба забраць дзяцей з вуліцы, прывесці іх у секцыі, выхаваць сваіх трэнераў. Мы 20 гадоў возім легіянераў, няўжо за 20 гадоў мы не падрыхтуем сваіх людзей? Я нічога не маю супраць спартсменаў, якія прыязджаюць бароцца за Беларусь. Але я буду патрабаваць ад іх максімальнай аддачы той краіне, якая стварыла для іх усе ўмовы і дапамагла ўсяго дасягнуць.

І вельмі прыемна, што ў нас ужо з'яўляюцца таленавітыя маладыя спецыялісты. Кірыл Фаменкаў — перспектыўны трэнер па грэка-рымскай барацьбе. Віктар Серада добра працуе з моладдзю ў вольнай барацьбе. Барацьба — гэта не проста спалучэнне рук, гэта цэлы механізм. І спартсмен павінен быць цэльным механізмам у спорце, у быце, у адносінах да сябе і грамадства. Калі ўсё гэта ёсць у адной асобе — ёсць вынік. І задача трэнераў — усе такія якасці ў дзяцей залажыць, бо часта трэнеры праводзяць з дзецьмі больш часу, чым бацькі.

***— Алім Максімавіч, Бабруйская школа барацьбы вядомая на ўсю краіну сваімі поспехамі. А якія яшчэ рэгіянальныя школы вы можаце вылучыць?***

— Сапраўды, Бабруйск і жаночая барацьба — гэта наш гонар. Я нават жартаваў, ці трэба нам развіваць мужчынскую вольную барацьбу, калі дзяўчаты з усім спраўляюцца. На жаль, у вольнай барацьбе ў нас няма школ, якія б трымалі высокую планку. У грэка-рымскай добра сябе праяўляе Гродна. Апошнім часам паднялася Мінская вобласць. На жаль, Гомельская школа здала пазіцыі. Калісьці ў яе былі вельмі добрыя вынікі. Імёны Ігара Пятрэнкі, Аляксандра Кікінёва (удзельніка дзвюх Алімпіяд), алімпійскіх прызёраў Вячаслава Макаранкі і Джавіда Гамзатава і яшчэ мноства спартсменаў кажуць самі за сябе. А цяпер пытанне — у гомельскай школы няма сваёй залы. Барцы трэніруюцца ў вузкім пакоі з невысокімі столямі. І гэтая вялікая праблема рэгіёнаў, якую трэба тэрмінова вырашаць. Хацелася б дастукацца да рэгіянальных чыноўнікаў, пераканаць іх звярнуць увагу на барацьбу. Пакуль з такімі адносінамі вельмі цяжка развіваць спорт у рэгіёнах. Барацьба — не самы фінансава затратны від спорту, але медалеёмісты. Мы пастаянна даказваем, што апраўдваем усе ўскладзеныя на нас чаканні. І вялікі дзякуй нашым спонсарам — кампаніям «Белнафтахім», «Гомельтранснафта Дружба» і іншым арганізацыям, якія нам дапамагаюць.



**«Некалькі гадоў таму грэка-рымская барацьба была на мяжы выключэння з алімпійскай сям'і. Старэйшы від спорту! Тады ўвесь барцоўскі свет падняўся на дыбкі».**

***— Якія асаблівасці беларускай школы барацьбы вы можаце вылучыць?***

— На жаль, наша вольная барацьба за апошнія 20 гадоў страціла свае традыцыі. Беларускіх традыцый проста няма. А ў грэка-рымскай засталіся манеры правядзення схватак, беларусы бороцца паводле сваёй тактыкі. Таму з намі не любяць бароцца. Беларусы «нязручныя» для сапернікаў. А чаму мы не павінны такія быць? Дзяўчаты сваё майстэрства даказваюць, у іх і рэзерв добры ёсць, мы гэта ўбачылі на юніёрскім чэмпіянаце свету. А вольную барацьбу мы пакуль упускаем, і гэтую праблему трэба вырашаць.

***— Ваш прыклад заахвоціў вашых дзяцей на заняткі барацьбой?***

— Майму сыну восем гадоў, і я хачу, каб ён займаўся спортам. Ён з пяці гадоў займаецца фізічнай культурай. Мы разам ходзім на трэніроўкі, у зал боксу, бегаем кросы. Ён хадзіў на футбол, гімнастыку, цяпер займаецца плаваннем. Я яго ўсебакова падрыхтаваў да таго моманту, калі яго фізічна падрыхтаваным можна было аддаць на барацьбу. Першы год ён там рабіў глупства, але нечаму навучыўся. Цяпер ужо займаецца адказна. Ён у любым выпадку прапусціць праз сябе гэты від спорту. Стане ён вялікім спартсменам ці не — іншае пытанне. Я для гэтага зраблю ўсё магчымае, калі будзе патрэбна. Але з іншага боку, мне хочацца, каб мой сын зарабляў не сілай мускулаў, а сілай мозга, які таксама трэба ўмацоўваць. У яго быў выбар: тры разы на тыдзень займацца барацьбой ці англійскай мовай. Мы выбралі англійскую мову, без якой нікуды. Сам ад гэтага цярплю і ў 38 гадоў стараюся вывучаць. Захоча сын стаць барцом — дапамагу, знойдзе сябе ў іншым — таксама падтрымаю.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Остров чистоты и вкуса

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СЧАСТЛИВЫЙ

**1. Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «Торговая компания Ромакс» (Далее – Организатор). УНП 190761848. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 04.10.2006 г. № 2011. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190761848.

Местонахождение Организатора: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8

Почтовый адрес: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8

**2. Наименование Рекламной игры.**

**«Счастливый случай. 4 сезон. Тур 7».**

**3. Территория проведения.**

Магазины «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» на территории Республики Беларусь и интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by.

**4. Сроки проведения.**

14.10.2021 – 23.12.2021 (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

1. Смаль Арина Олеговна, ООО «Торговая компания Ромакс», маркетолог.

Члены комиссии:

1. Стасюк Евгений Владимирович, ЧТУП «ЗападХимТорг», начальник отдела рекламы.
2. Гулак Анна Владимировна, ЧТУП «ЗападХимТорг», специалист по маркетингу.
3. Щука Анна Николаевна, ООО «ЗападХимИнвест», дизайнер.
4. Приявко Оксана Федотовна, ООО «Торговая компания Ромакс», маркетолог.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции торговых марок (далее Товары-счастливчики) Master Fresh, Exxe UFC, Kucharek, Avokado, Relouis, Lenor, Мара Узор Чысціні, Chupa Chups, Discreet, Always, Pampers, Conte Elegant, указанных в Приложении 1, реализуемых в магазинах «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» и интернет-магазинах ostrov-shop.by, zht.by; zhs.by; zhi.by.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 14.10.2021 по 17.11.2021 включительно:

1. Совершить покупку Товаров-счастливчиков на сумму не менее 10 (десяти) белорусских рублей в любом магазине «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» или на сайте интернет-магазинов ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by, с использованием при расчете за покупку дисконтную карту «Остров чистоты и вкуса», «Остров чистоты».

Покупатели, осуществляющие расчёт за товар на кассе торгового объекта «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» с использованием карт рассрочек («Халва», «Карта покупок», «Карта Fun» и др.), не могут быть участниками Рекламной игры, так как дисконтная карта не может быть применена при расчёте картами рассрочек в соответствии с программой лояльности «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса».

2. Достоверно заполнить персональные данные в личном кабинете на сайте ostrov-shop.by (далее Интернет-сайт) в день совершения покупки (или до момента оформления заказа через интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by) и подтвердить согласие на участие в Рекламной игре на Интернет-сайте (либо проверить корректность ранее заполненных данных), а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (если такое имеется);
- адрес проживания, пребывания в Республике Беларусь: область (обязательно), район (обязательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате (обязательно);
- оператор сотовой связи А1, МТС, life:) (обязательно).

В случае если Персональные данные и согласие на участие в рекламных мероприятиях было подтверждено ранее, повторное подтверждение не требуется.

Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т.д.) автоматически по порядку.

Участник получает один Игровой код за покупку «Товаров-счастливчиков» на сумму не менее 10 белорусских рублей (десять) в чеке при покупке в торговых объектах «Остров Чистоты» или «Остров Чистоты и вкуса», на сайте интернет-магазинов ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by (например, за покупку Товаров-счастливчиков на сумму 70 (семьдесят) белорусских рублей в чеке участник получает семь Игровых кодов).

Каждому покупателю, который впервые совершил действия, указанные в пп. 1 и пп. 2 п. 7 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного, Игровой код на дату и время регистрации на Интернет-сайте.

Каждому покупателю, который совершил повторные действия, указанные в пп. 1 настоящих Правил (и который прошел прежде регистрацию на Интернет-сайте, согласно пп. 2 п. 7), присваивается порядковый Игровой код по дате и времени покупки.

Присвоенные Игровые коды отображаются в диалоговом окне личного кабинета Интернет-сайта в течение 5 (пяти) суток после присвоения.

Каждый участник может принимать участие в рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения установленных условий Рекламной игры.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 62121,35 (шестьдесят две тысячи сто двадцать один) рубль тридцать пять копеек и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за ед., бел. руб. с НДС | Всего, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль Renault Logan, 2021 г. в, РФ, X7L4SRLVG67806506** | 1 | 31 949,00 | 31 949,00 |
| | и денежное вознаграждение далее Суперприз | 1 | 4751,57 | 4751,57 |
| 2 | **Смартфон Xiaomi Redmi Note 10 Pro 6GB/128GB (Onyx Gray)** | 10 | 969,00 | 9690,00 |
| | и денежное вознаграждение | 10 | 122,38 | 1223,80 |
| 3 | **Контактный гриль DeLonghi CGH1012D** | 10 | 888,792 | 8887,92 |
| | и денежное вознаграждение | 10 | 110,39 | 1103,90 |
| 4 | **Паровая швабра Karcher SC 2 Upright 1.513-345.0** | 10 | 294,00 | 2940,00 |
| | и денежное вознаграждение | 10 | 21,52 | 215,20 |
| 5 | **Фитнес-трекер Xiaomi Mi Smart Band 6 BHR4951GL/XMSH15HM** | 10 | 135,996 | 1359,96 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 23 ноября 2021 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Кульман, 35А, 7-й этаж, комната переговоров.

**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**

К моменту проведения розыгрыша Организатором формируется список Игровых кодов по возрастанию, сформированный согласно п. 7 настоящих Правил, с указанием фамилии, имени, отчества (при наличии) Участников, номера дисконтной карты, даты подтверждения согласия на участие в Рекламной игре, даты и времени совершения покупки. Игровые коды имеют одинаковую разрядность.

Для проведения розыгрыша используется лототрон, состоящий из 7 секций, каждая из которых соответствует определенному разряду Игрового кода, и несколько наборов шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секций лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в п. 8 настоящих Правил.

Игровой код победителя, выигравший Суперприз, может признаваться выигрышными только один раз. В случае повторного попадания в Игровой код, уже выигравший Суперприз в розыгрыше, выигрышным считается следующий по списку Игровой код.

Если следующий за выигрышным Игровой код принадлежит победителю, выигравшему Суперприз, то выигравшим становится следующий после него первый Игровой код иного участника. В случае если Игровой код попадает на конец списка, то выигрышным будет считаться первый Игровой код иного участника с начала списка.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка по 30 ноября 2021 года включительно.

